Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя П.М. Машэрава"
Кафедра беларускай літаратуры

# МЕТАДАЛОГІЯ СУЧАСНАГА ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

***Метадычныя рэкамендацыі***

Репозиторий ВГУ

*Віцебск*
*ВДУ імя П.М. Машэрава*
*2012*

ББК 83.0я73
УДК 82.0(075.8)
М54

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава". Пратакол № 1 ад 13.09.2012 г.

Складальнік: прафесар кафедры беларускай літаратуры ВДУ імя П.М. Машэрава, доктар філалагічных навук **В.Ю. Бароўка**

Р э ц э н з е н т :
загадчык кафедры літаратуры ВДУ імя П.М. Машэрава,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт *В.В. Лапацінская*

Репозиторий ВГУ

**М54** **Метадалогія сучаснага літаратуразнаўства** : метадычныя рэкамендацыі / склад. В.Ю. Бароўка. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2012. – 50 с.

Метадычныя рэкамендацыі па курсе "Метадалогія сучаснага літаратуразнаўства" прызначаны для студэнтаў-філолагаў дзённай і завочнай форм навучання. Яны ўключаюць вучэбную праграму, канспектыўны матэрыял лекцый, план і тэматыку практычных заняткаў, пытанні да экзамену (заліку), спіс літаратуры.

**ББК 83.0я73**
**УДК 82.0(075.8)**

© ВДУ імя П.М. Машэрава

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Курс “Метадалогія сучаснага літаратуразнаўства” праблемна-тэматычна і метадалагічна развівае змест вучэбных курсаў “Уводзіны ў літаратуразнаўства” і “Тэорыя літаратуры”. У працэсе вывучэння “Метадалогіі сучаснага літаратуразнаўства” ўдакладняецца і паглыбляецца паняцце пра літаратуразнаўчую метадалогію, характарызуюцца метады, напрамкі, школы, тэорыі, канцэпцыі літаратурнай творчасці, асноўныя падыходы да разгляду мастацкіх твораў, прынятыя ў сусветным і айчынным літаратуразнаўстве.

*Мэта* курса “Метадалогія сучаснага літаратуразнаўства” – пашырэнне ведаў студэнтаў пра літаратуразнаўчую метадалогію, азнаямленне з гісторыяй фарміравання і функцыянавання разнастайных літаратуразнаўчых метадалагічных напрамкаў, школ, плыней, замацаванне атрыманых ведаў шляхам аналізу тэарэтыка-метадалагічных прац, а таксама літаратурных твораў на аснове прыёмаў канкрэтных навуковых метадаў. *Задачы* курса вынікаюць з мэты і заключаюцца ў тым, каб узбагаціць веды студэнтаў тэорыяй і практыкай сучаснага літаратуразнаўчага даследавання, удасканаліць уменні выбіраць дэтэрмінаваны эстэтычным матэрыялам, непасрэднымі задачамі навуковага асэнсавання від разгляду твора, замацаваць і развіць навыкі аналізу мастацкіх твораў, выпрацаваныя на аснове класічнай літаратуразнаўчай метадалогіі.

Прадметам вывучэння курса “Сучасная літаратуразнаўчая метадалогія” з’яўляецца метадалогія літаратуразнаўства XIX–XX стагоддзяў, напрацоўкі якой актыўна і творча выкарыстоўваюцца навукоўцамі пачатку XXI стагоддзя. Метадычныя рэкамендацыі “Метадалогія сучаснага літаратуразнаўства” ўключаюць вучэбную праграму, канспектыўны матэрыял лекцый, план і тэматыку практычных заняткаў, пытанні да экзамену (заліку), спіс літаратуры.

## ПРАГРАМА КУРСА
## “МЕТАДАЛОГІЯ СУЧАСНАГА ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА”

(зацверджана Навукова-метадычным саветам
УА “ВДУ імя П.М. Машэрава” 28.05.2012 г., рэг. № УД-08-044/ баз.)

*Паняцце пра метадалогію.* Месца і роля метадалогіі ў навуцы пра літаратуру. Метадалогія і методыка. Аналіз літаратурнага твора як катэгорыя метадалогіі. Метад, прынцып і падыход як катэгорыі аналізу. Агульнанавуковыя і прыватнанавуковыя падыходы да аналізу літаратурных твораў.



Репозиторий ВГУ

*Міфалагічная школа*. Тэарэтычныя погляды братоў Грымаў і іх прыхільнікаў на паходжанне і развіццё мастацкай літаратуры, на аналіз літаратурных твораў. Рытуальна-міфалагічная крытыка. Структурны каркас напрамкаў, жанраў і вобразаў, распрацаваны Н. Фраем. Міфапаэтыка, развіццё яе ідэй у беларускім літаратуразнаўстве (даследаванні В. Каваленкі, Т. Шамякінай, С. Даніленкі інш.).

*Кампаратывізм.* Нараджэнне параўнальна-гістарычнага метаду ў сферы вывучэння фальклору і старажытнай літаратуры (40-я гады XIX ст.). Роля ва ўзнікненні і развіцці параўнальна-гістарычнага метаду прац Ф. Шаля (1847–1864) і Т. Бенфея (1809–1881). Міграцыйная тэорыя Бенфея. Народна-псіхалагічная школа Х. Штэйнталя і М. Лацаруса. Выяўленне агульнага для першабытных народаў анімізму (Э.Б. Тэйлар). Заснаванне антрапалагічнай тэорыі (Э. Лэнг), тэорыі самазараджэння сюжэтаў. Даследаванне перадумовы запазычванняў А. Весялоўскім. “Гістарычная паэтыка” А. Весялоўскага. Гісторыка-параўнальнае літаратуразнаўства (працы В. Жырмунскага, М. Конрада, М. Аляксеева, І. Неўпакоевай, А. Адамовіча, В. Гапавай, В. Каваленкі, А. Мальдзіса і інш.).

*Культурна-гістарычная школа.* Погляды на літаратуру І.-А. Тэна. Спробы прыхільнікаў Тэна ператварыць літаратуразнаўства ў дакладную навуку (працы П. Лакомба, Г. Брандэса, Г. Гетнера і інш.). Моцныя і слабыя бакі культурна-гістарычнай школы: даследаванне спецыфікі нацыянальных літаратур, трактоўка сутнасці мастацтва на аснове ідэй пазітывізму і метадаў прыродазнаўчых навук. Развіццё ідэй І.-А. Тэна ў даследаваннях навукоўцаў XX ст. (П. Сакулін, В. Парынгтан, “універсітэцкая крытыка” Францыі). Імагалогія. Культурна-гістарычны напрамак у беларускім літаратуразнаўстве. Выкарыстанне ідэй культурна-гістарычнай школы Я. Карскім, В. Ластоўскім, М. Гарэцкім, А. Навінам і інш. Суадносіны “трыяды” Тэна з прынцыпамі літаратуразнаўчага аналізу І.І. Замоціна.

*Інтуітывізм.* Інтуітывізм як апазіцыя пазітывізму ў гуманітарных навуках. Тэарэтычнае абгрунтаванне ідэй інтуітывізму (“Смех” А. Бергсона). Адмаўленне ад традыцыйных катэгорый роду, віду і жанру (“Эстэтыка” Б. Крочэ). Класіфікацыя літаратурных твораў на аснове псіхалагічнай дыферэнцыяцыі (“Нараджэнне трагедыі з духу музыкі” Ф. Ніцшэ). Стварэнне духоўна-гістарычнай школы (В. Дыльтэй, Р. Унгер, Ф. Гундальф і інш.), яе асаблівасці: акцэнт на спецыфіцы і аўтаноміі мастацкіх з’яў, апора на інтуіцыю, замацаванне мастакоў за адной з форм “духоўнай гісторыі” паводле сацыяльнай пазіцыі пісьменніка.

*Біяграфічны метад*, яго абумоўленасць сацыякультурнымі абставінамі, абсалютызацыя ролі біяграфіі ў мастацкай творчасці. “Літаратурныя партрэты” Ш. Сент-Бёва. Развіццё ідэй біяграфічнага

Рэпазіторый ВДУ

метаду ў беларускім літаратуразнаўстве (В.І. Атрашкевіч, Т.Я. Камароўская і інш.).

*Псіхалагічная школа* (Г. Тард, Э. Энекен, А. Патабня, Д. Аўсяніка-Кулікоўскі інш.). Даследаванне душы аўтара, псіхалогіі творчасці як сублімацыі перажыванняў у мастацкім вобразе. Вывучэнне псіхалогіі творчасці навукоўцамі XX стагоддзя ("Псіхалогія мастацтва" Л. Выгоцкага, кнігі пра творчую лабараторыю пісьменніка П. Мядзведзева, А. Цэйтліна, Г. Лянобля і інш.). Распрацоўка псіхалагічных праблем творчасці А.П. Матрунёнкам, А.С. Яскевічам і інш.

Псіхааналіз у літаратуразнаўстве. Трактоўка мастацкіх твораў у адпаведнасці з вучэннем пра бессвядомае. Даследаванне біяграфічных крыніц творчасці З. Фрэйдам ("Паэт і фантазія", "Дастаеўскі і бацьказабойства"), нацыянальнай падсвядомасці ў яе агульначалавечых формулах-архетыпах К.-Г. Юнгам. Псіхалагізм стыхій і іх мастацкае ўвасабленне ў Г. Башляра. Вульгарны псіхалагізм: трактоўка творчага працэсу як ілюзіі, як задавальнення біялагічных інстынктаў (1920–1930-я гг.). Два напрамкі псіхааналізу ў другой палове XX ст.: экзістэнцыйны (Ж.-П. Сартр, А. Мальро) і структуральны (Ж. Лакан, Р. Барт).

*Фармалістычны напрамак* як рэакцыя на інтуітывізм і псіхалагізм у літаратуразнаўстве. Расійскія фармалісты: ОПОЯЗ і "Маскоўскі лінгвістычны гурток". Культ формы. Тэорыя "остранения" В. Шклоўскага. Вучэнне пра іранічны аспект і парадаксальнасць паэтычнай мовы. Уплыў ОПОЯЗа на заходняе літаратуразнаўства. Фармальна-мастацкі напрамак у беларускім літаратуразнаўстве (А. Вазнясенскі і інш.).

*"Новая крытыка"*. Ідэі неакрытыцызму ў працах Т.С. Эліёта. Пераацэнка літаратуразнаўчых набыткаў вучонымі ЗША ў 1930-я гады. Вучэнне пра структуру і тэкстуру (Дж. Рэнсам). Развіццё тэорыі "остранения" В.Б. Шклоўскага К. Бруксам. "Парадаксалізацыя" паэзіі. "Новая крытыка" ў Францыі (сярэдзіна 1950–1960-х гг.). "Генетычны структуралізм" Л. Гальдмана, псіхакрытыка Ш. Марона. Р. Барт як ідэолаг "новай крытыкі". Структуралісцкія тэндэнцыі, звязаныя са стварэннем агульнай паэтыкі (Ц. Тодараў), тэорыі сюжэта і аповеду (А.-Ж. Грэймас, К. Брэмон, Ж. Жэнет), неарыторыкі (група "Мю", П. Гіро). Адрозненне англійскай, амерыканскай і французскай "новых крытык", асэнсаванне іх вопыту ў Беларусі (М. Тычына і інш.).

*Структуралізм*: выкарыстанне семіётыкі, ідэй і прыёмаў лінгвістыкі тэксту (Р. Якабсон, М. Рыфатэр), даследаванняў бінарных апазіцый, ментальных структур (К. Леві-Строс), праблем сюжэтабудовы (У. Проп, А. Грэймас), сацыялогіі літаратуры (Ц. Тодараў). Французская (Р. Барт, Ц. Тодараў, Ю. Крысцева) і англа-



Рэпазіторый ВДУ

амерыканская школы (Ч.-С. Пірс, Ч. Морыс), вылучэнне псіхааналітычнай (Ж. Лакан) і сацыялагічнай (Л. Гальдман) тэндэнцый. Тартуска-маскоўская семіятычная школа (Ю. Лотман, Б. Успенскі, В. Іваноў, А. Пяцігорскі і інш.).

*Генератыўная паэтыка*, яе сутнасць, вытокі, эвалюцыя. Адрозненне глыбінных і павярхоўных структур. Развіццё генератыўнай метрыкі.

*Фенаменалагізм*. Фарміраванне метаду і школы ў 1920–1930-х гг. Эйдасы Э. Гусерля, іх разгляд Г. Абаскам і С. Каўфманам. Канцэпцыя структурных пластоў (Н. Гартман), яе развіццё нямецкімі (М. Гейгер, А. Гергер, І. Пфайфер) і польскімі (Р. Інгардэн, Ю. Клейнер) навукоўцамі. Пераўтварэнне фенаменалагічнай крытыкі ў своеасаблівы варыянт структуральнага псіхааналізу, а таксама ў "марфалагічнае літаратуразнаўства" на грунце "гештальтпсіхалогіі", "марфалогіі традыцый" Э. Курцыуса. Эвалюцыя фенаменалагізму ў бок экзістэнцыялізму і герменеўтыкі.

*Экзістэнцыялізм* у літаратуразнаўстве. Вытокі ў працах філосафа XIX ст. С. К'еркегора: гегелеўскі панлагізм, антытэза "сістэмы" і "экзістэнцыі". Далейшае развіццё ў працах М. Хайдэгера, К. Ясперса, А. Камю, Ж.-П. Сартра. Артыкул Хайдэгера "Гёльдэрлін і сутнасць паэзіі".

*Герменеўтыка*. Эвалюцыя ад майстэрства тлумачыць прароцтвы аракула, Біблію (экзегетыка) да навуковага напрамку ў гуманітарных навуках. Тэхніка рэканструкцыі, "герменеўтычнае кола" Ф. Шлеермахера (1768–1834). Перанос інтэрпрэтацыі з філалогіі ў гісторыю (В. Дыльтэй, 1833–1911). Мадэль Э. Бэці (1890–1968). Сістэматызацыя канонаў: законы аўтаноміі, татальнасці, правілы актуальнасці разумення і сэнсавай адэкватнасці, кансанансу. "Зліццё даляглядаў", актуалізацыя, аплікацыя, метафара "герменеўтычнага трохкутніка", распрацаваныя Г.Г. Гадамерам. Арыгінальны варыянт герменеўтыкі на стыку рэфлесіўнай філасофіі, фенаменалогіі, аналітычнай філасофіі мовы ў П. Рыкёра, "неагерменеўтыка" (Э.Д. Хірш). Літаратуразнаўчыя ідэі М.М. Бахціна. Гісторыка-функцыянальнае літаратуразнаўства, яго развіццё ў работах беларускіх літаратуразнаўцаў М.І. Мушынскага, З.П. Мельнікавай.

*Рэцэптыўная эстэтыка*, яе тэарэтыкі – В. Ізер, Г.Р. Яус. Адмаўленне стабільнасці тэкставага значэння. Развіццё ідэй нямецкай школы "чытацкіх рэакцый" у працах С. Фіша "Здзіўлены грахом: чытач у "Страчаным раі"; "Літаратура ў чытачоў: афектыўная стылістыка". Канцэнтрацыя ўвагі "крытыкаў з Бафала" не на чытачы, а на псіхалагічных рэакцыях у працэсе чытання (Д. Блейх, Н. Холанд, М. Шварц), іх салідарызацыя з фенаменолагамі і псіхалагістамі. Працы І.П. Смірнова.

Рэпазіторый ВДУ

*Сацыялагічнае літаратуразнаўства.* Традыцыі сацыялагізму ад Платона да Маркса, рух ад мімесісу (тэорыі перайманя) да тэорыі адлюстравання. Марксісцкая крытыка з другой паловы XIX ст. (Ф. Мерынг, П. Лафарг, Г. Пляханаў і інш.), наданне ёй афіцыйнага статусу ў СССР. Атрыбутыўныя рысы сацыялагічнага напрамку. Выкарыстанне ідэй неа- і постмарксізму ў работах А. Грамшы, Д. Лукача, Т. Адорна, Г. Маркузэ, Ю. Хабермаса і інш. Ідэі Франкфурцкай школы, "аднамерны чалавек" Г. Маркузэ. Распрацоўка Ю. Хабермасам канцэпцыі дыскурсу як спецыяльнай формы моўнай камунікацыі з апорай на тэорыю маўленчых актаў Дж. Осціна.

*Сацыялагічны напрамак* у беларускім літаратуразнаўстве (М. Байкоў, З. Жылуновіч, М. Піятуховіч і інш.). Канцэпцыя "двух актаў" крытыкі Г. Пляханава як метадалагічны прынцып сацыялагічнага напрамку. Абсалютызацыя сацыялагічнага пачатку твора, адыход ад эстэтычнага аналізу ў бок вульгарнага сацыялагізму. Вульгарны сацыялагізм (В. Фрычэ, В. Пераверзеў, В. Келтуяла; у Беларусі – Л. Бендэ, А. Кучар): ігнараванне мастацкай формы, акцэнтацыя класавай ідэалогіі. Ідэі псіхаідэалогіі ў В. Пераверзева і М. Байкова. Сацыякультурная крытыка, распрацоўка яе ідэй Ф.Р. Лівісам (1895–1978). Абумоўленасць асаблівасцей літаратурнай эпохі сацыякультурным фонам, філасофскай і сацыяльнай парадыгмай; улік эканамічных фактараў; узроўню развіцця цывілізацыі; камбінацыі тэорый на грунце структуралісцкай і сацыялагічнай метадалогіі (сцвярджэнне Л. Гальдмана пра перавагу ментальных структур над свядомымі палітычнымі перакананнямі).

*Постструктуралізм.* Філасофскія асновы, пераасэнсаванне ідэй структуралізму (працы Ж. Дэрыды, Ж. Дэлёза, Ф. Гватары, Ж. Бадрыяра, Ж. Ліятара, Ю. Крысцевай, М. Фуко, "позняга" Р. Барта).

*Дэканструктывізм як літаратуразнаўчая версія постструктуралізму:* прадмет – тэксты, мэта – пераадоленне тэксту шляхам дэканструкцыі. Тэкст – выдумка наіўнага чытача і крытыка, якія – таксама своеасаблівы тэкст (Ж. Дэрыда). Прыхільнікі Дэрыды з Ельскага ўніверсітэта (Г. Блум, Дж. Хартман, П. дэ Ман і інш.), іх арыентацыя на ўнутраныя магчымасці тэксту. Неарытарызм, "трапізм" ("Разрыў формы" Г. Блума). Семантычны нігілізм, ідэя абсалютнага самавольства маўлення: "дысфігурацыя" П. дэ Мана ("Алегорыя чытання: фігуры маўлення ў Русо, Ніцшэ, Рыльке і Пруста").

*Постмадэрнізм.* Антыкартэзіянская парадыгма мыслення, мовы (Ф. дэ Сасюр), яе ўплыў на ідэі постмадэрнізму ў літаратуразнаўстве. Увядзенне сімулякра Ж. Батаем, яго вопыт "абсалютнай негатыўнасці", "суверэннасці" і "трансгрэсіі". Пераасэнсаванне псіхааналізу Ж. Лаканам. Адмаўленне ад гегельянства як зыходны



Репозиторий ВГУ

пастулат М. Фуко. Суб’ект як фокус саматрансфармацыі. Антрапалогія па-за фенаменалогіяй і псіхааналізам. Вучэнне аб “эпістэме”, яе “канфігурацыі”. Філасофія як анталогія сучаснасці. Стварэнне Р. Бартам Цэнтра па вывучэнні масавых камунікацый (1960). Разгляд Бартам праблем пісьма і маўлення ў кантэксце праблемы абгрунтавання ведаў, праблемы адносін (“рэчы” і “сэнсу рэчаў”); масавай камунікацыі (чытанне і пісьмо ў кантэксце сацыялогіі”). “Інтэгральны атэізм”, “норма” як інстытут цэнзуры, аналіз рацыянальнасці і ўлады, “вопыту немагчымага” ў М. Бланшо. Сінтэз вучэння пра “волю да ўлады” Ф. Ніцшэ, экзістэнцыялізму М. Хайдэгера, суб’ектыўна-экзістэнцыйнай дыялектыкі Батая. Тэорыя знака, “значэння” як элемента ўладнага кантролю, “сістэмы рэчаў”, прапанаваная Ж. Бадрыярам. Антыметафізіка як альтэрнатыва дэканструкцыі Ж. Дэрыды, гісторыка-філасофская дэструкцыя, тэорыя “намадалагічнага мыслення”, распрацаваная Ж. Дэлёзам. Шызааналіз Ф. Гватары. Увядзенне і абгрунтаванне “рызомы”, “азначальна-азначаемага” (Ж. Дэлёзам і Ф. Гватары). Ідэя “наратыўнасці”, “мова ўлады” ў Ж.-Ф. Ліятара. “Дэканструктывізм” як дэканструкцыя “метафізікі” ў Ж. Дэрыды. Семаналіз, пераасэнсаванне ўзаемазалежнасці “суб’ект – мова”, феномен інтэртэксту ў Ю. Крысцевай, развіццё ёю ідэй М.М. Бахціна.

*“Новы гістарызм”.* Спрэчкі вакол паняцця і метадалогіі “новага гістарызму”.

*Біяпаэтыка* як спроба пошуку новай метадалогіі, яе станоўчыя і адмоўныя бакі.

*Сучаснае беларускае літаратуразнаўства.* Праблематыка і метадалогія.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Адамовіч, А.М. Здалёк і зблізку : беларус. проза на літ. планеце / А.М. Адамовіч. – Мінск : Маст. літ., 1976. – 623 с.

2. Адамовіч, А.М. Культура творчасці / А.М. Адамовіч. – Мінск : Дзяржвыд БССР, 1959. – 237 с.

3. Академические школы в русском литературоведении XIX века. – М. : Наука, 1975. – 515 с.

4. Андреев, А.Н. Методология литературоведения / А.Н. Андреев. – Минск : Аверсэв, 2000. – 220 с.

5. Андреев, А.Н. Целостный анализ литературного произведения / А.Н. Андреев. – Минск : Науч. метод. центр, 1995. – 144 с.

6. Афасижев, М.Н. Западные концепции художественного творчества / М.Н. Афасижев. – М. : Высш. школа, 1990. – 176 с.

7. Багдановіч, І.Э. Авангард і традыцыя : беларус. паэзія на хвалі нац. адраджэння / І.Э. Багдановіч. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 387 с.

Репозиторий ВГУ

8. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991–1994. – Т. 2 : Мастацкая проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды. – 1993. – 600 с.
9. Бароўка, В.Ю. Тэорыя літаратуры / В.Ю. Бароўка. – Віцебск : Выд-ва Віцеб. дзярж. ун-та, 2005. – 48 с.
10. Барт, Р. Избранные работы. Семиотика. Поэтика / Р. Барт. – М. : Прогресс, 1989. – 616 с.
11. Бахтин, М.М. Литературно-критические статьи / М.М. Бахтин. – М., 1986. – 541 с.
12. Бахтин, М.М. Эстетика словесного творчества / М.М. Бахтин. – 2-е изд. – М. , 1986. – 444 с.
13. Белецкий, А.И. В мастерской художника слова / А.И. Белецкий. – М. : Высш. школа, 1989. – 158 с.
14. Бельскі, А.І. Свет ад травы да зор : беларус. паэзія : сістэма вобразаў прыроды, паэтыка пейзажу : дапам. для наст. / А.І. Бельскі. – Мінск : Нар. асвета, 1998. – 222 с.
15. Белянин, В.П. Психологическое литературоведение : текст как отражение внутреннего мира автора и читателя / В.П. Белянин. – М. : Генезис, 2006. – 320 с.
16. Васючэнка, П.В. Ад тэксту да хранатопа : артыкулы, эсэ, пятрогліфы / П.В. Васючэнка. – Мінск : Галіяфы, 2009. – 200 с.
17. Веселовский, А.Н. Историческая поэтика / А.Н. Веселовский. – М. : Высш. школа, 1989. – 409 с.
18. Выготский, Л.С. Психология искусства / Л.С. Выготский. – М. : Педагогика, 1987. – 341 с.
19. Гадамер, Г.Х. Истина и метод : основы филос. герменевтики / Г.Х. Гадамер. – М. : Прогресс, 1988. – 699 с.
20. Гараднiцкi, Я.А. Мастацкі свет беларускай літаратуры XX стагоддзя / Я.А. Гараднiцкi. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – 206 с.
21. Гараднiцкi, Я.А. Паэтыка беларускай літаратуры XX стагоддзя / Я.А. Гараднiцкi. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – 332 с.
22. Гачев, Г.Д. Национальные образы мира: общие вопр. Русский. Болгарский. Киргизский. Грузинский. Армянский / Г.Д. Гачев. – М. : Совет. писатель, 1988. – 445 с.
23. Гачев, Г.Д. Национальные образы мира. Соседи России : Польша, Литва, Эстония / Г.Д. Гачев. – М. : Прогресс-Традиция, 2003. – 384 с.
24. Гніламёдаў, У.В. Класікі і сучаснікі / У.В. Гніламёдаў. – Мінск : Маст. літ., 1987. – 286 с.
25. Гніламёдаў, У.В. Сучасная беларуская паэзія : творчая індывідуальнасць і літаратурны працэс / У.В. Гніламёдаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 304 с.

Репозиторий ВГУ

26. Даніленка, С.І. Харунжыя Бога : спецыфіка сацыяльнай міфалагізацыі ў беларускай літаратуры XIX–XX стагоддзяў у кантэксце яе інфернальнай вобразнасці / С.І. Даніленка. – Магілёў : Выд-ва Магілёўс. ун-та, 2005. – 180 с.

27. Дима, А. Принципы сравнительного литературоведения ; пер. с рум. / А. Дима. – М. : Прогресс, 1977. – 229 с.

28. Дюришин, Д. Теория сравнительного изучения литературы ; пер. со словац. / Д. Дюришин. – М. : Прогресс, 1979. – 320 с.

29. Женнет, Ж. Фигуры : в 2 т. / Ж. Женнет. – М. : Изд-во им. Собашниковых, 1998. – Т. 1. – 438 с.

30. Жирмунский, В.М. Байрон и Пушкин ; Пушкин и западные литературы / В.М. Жирмунский. – Л. : Наука, 1978. – 423 с.

31. Жирмунский, В.М. Сравнительное литературоведение : Восток и Запад / В.М. Жирмунский. – Л.: Наука, 1979. – 493 с.

32. Жирмунский, В.М. К вопросу о «формальном методе» / В.М. Жирмунский // Русская словесность : антология ; под общ. ред. В.П. Нерознака. – М., 1997. – С. 126

33. Жирмунский, В.М. Эпическое творчество славянских народов и проблемы сравнительного изучения эпоса / В.М. Жирмунский. – М. : Изд-во АН СССР, 1958. – 380 с.

34. Жолковский, А.К. Блуждающие сны / А.К. Жолковский. – М. : Совет. писатель, 1992. – 429 с.

35. Жук, І.В. Празаічны тэкст : дынаміка рытмавага існавання / І.В. Жук. – Гродна : Выд-ва Гродзен. дзярж. ун-та, 2003. – 234 с.

36. Жураўлёў, В.П. На шляху духоўнага самасцвярджэння / В.П. Жураўлёў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 160 с.

37. Жураўлёў, В.П. Структура твора : рух сюжэтна-кампазіцыйных форм / В.П. Жураўлёў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 311 с.

38. Жураўлёў, В.П. Якуб Колас і паэтыка беларускага рамана / В.П. Жураўлёў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 208 с.

39. Замоцін, І.І. Творы / І.І. Замоцін. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 335 с.

40. Западное литературоведение XX века : энциклопедия. – М. : Интрада, 2004. – 559 с.

41. Зарубежная эстетика и теория литературы XIX–XX вв. : трактаты, статьи, эссе. – М. : Изд-во Моск. гос. ун-та, 1987. – 510 с.

42. Ильин, И.П. Постстуктурализм. Деконструктивизм. Постмодернизм / И.П. Ильин. – М. : Интрада, 1996. – 255 с.

43. Ингарден, Р. Исследования по эстетике / Р. Ингарден. – М. : Изд-во иностр. лит., 1962. – 572 с.

44. Каваленка, В.А. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць / В.А. Каваленка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 335 с.

Репозиторий ВГУ

45. Каваленка, В.А. Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры / В.А. Каваленка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 320 с.
46. Козлов, А.С. Литературоведение Англии и США XX века / А.С. Козлов. – М. : Высш. школа, 2004. – 275 с.
47. Конрад, Н.И. Запад и Восток / Н.И. Конрад. – М. : Наука, 1972. – 396 с.
48. Корань, Л.Д. Цукровы пеўнік : літ.-крыт. арт. / Л.Д. Корань. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 220 с.
49. Курилов, В.В. Теория и методология в науке о литературе / В.В. Курилов. – Ростов н/Д : Изд-во Ростов. гос. ун-та, 1985. – 122 с.
50. Ластоўскі, В. Выбраныя творы / В. Ластоўскі. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1997. – 512 с.
51. Ленобль, Г.М. Писатель и его работа : вопросы психологии творчества и художественного мастерства / Г.М. Ленобль. – М. : Совет. писатель, 1966. – 394 с.
52. Литературный энциклопедический словарь. – М. : Совет. энциклопедия, 1987. – 752 с.
53. Лотман, Ю.М. Анализ поэтического текста / Ю.М. Лотман. – Л. : Просвещение, 1972. – 271 с.
54. Лотман, Ю.М. Структура художественного текста / Ю.М. Лотман. – М. : Искусство, 1970. – 384 с.
55. Лявонава, Е.А. Агульнае і адметнае : творы беларус. пісьменнікаў XX ст. у кантэксце сусветнай літ. / Е.А. Лявонава. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 198 с.
56. Максімовіч, В.А. Эстэтычныя пошукі ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя : дапам. / В.А. Максімовіч. – Мінск : Аракул, 2000. – 321 с.
57. Мальдзіс, А.І. На скрыжаванні славянскіх традыцый / А.І. Мальдзіс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1977. – 352 с.
58. Матрунёнак, А.П. Псіхалагічная проза : традыцыі і час / А.П. Матрунёнак. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 205 с.
59. Медведев, П.Н. В лаборатории писателя / П.Н. Медведев. – Л. : Совет. писатель, 1971. – 392 с.
60. Мелетинский, Е.М. Средневековый роман : происхождение и классические формы / Е.М. Мелетинский. – М. : Наука, 1983. – 304 с.
61. Мельнікава, З.П. Беларускае гісторыка-функцыянальнае літаратуразнаўства / З.П. Мельнікава. – Брэст : Выд-ва Брэсц. дзярж. ун-та, 2002. – 276 с.
62. Мішчанчук, М.І. Ёсць у паэта свой аблог цалінны… / М.І. Мішчанчук. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 189 с.
63. Мушынскі, М.І. Беларуская крытыка і літаратуразнаўства : 20–30-я гады / М.І. Мушынскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 376 с.

Репозиторий ВГУ

64. Мушынскі, М.І. Беларуская крытыка і літаратуразнаўства : 40-я – першая палавіна 60-х гадоў / М.І. Мушынскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. 342 с.

65. Мушынскі, М.І. Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі : жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага / М.І. Мушынскі. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 510 с.

66. Нефедов, Н.Т. История зарубежной критики и литературоведения / Н.Т. Нефедов. – М. : Высш. школа, 1988. – 271 с.

67. Переверзев, В.Ф. У истоков русского реализма / В.Ф. Переверзев. – М. : Современник, 1989. – 750 с.

68. Потебня, А.А. Теоретическая поэтика / А.А. Потебня. – М. : Академия, 2003. – 384 с.

69. Поэтика : словарь актуальных терминов и понятий / гл. науч. ред. Н.Д. Тамарченко. – М. : Интрада, 2008. – 358 с.

70. Рагойша, В.П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапам. / В.П. Рагойша. – Мінск : Беларус. энцыкл., 2001. – 384 с.

71. Сент-Бев, Ш. Литературные портреты, критические очерки ; пер. с франц. / Ш. Сент-Бев. – М. : Худож. лит., 1970. – 582 с.

72. Современная литературная теория : антология / сост. И.В. Кабанова. – М. : Флинта : Наука, 2004. – 344 с.

73. Современное зарубежное литературоведение ; под ред. И.П. Ильина. – М. : Интрада, 1996. – 320 с.

74. Степанов, Г.В. Язык. Литература. Поэтика / Г.В. Степанов. – М. : Наука, 1988. – 380 с.

75. Томашевский, Б.В. Теория литературы. Поэтика : учеб. пособие. – М. : Аспект-Пресс, 1999. – 334 с.

76. Тынянов, Ю.Н. Поэтика. История литературы. Кино / Ю.Н. Тынянов. – М. : Наука, 1977. – 574 с.

77. Тычына, М.А. Аляксандр Пушкін і Якуб Колас / М.А. Тычына. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – 168 с.

78. Фатеева, Н. Контрапункт интертекстуальности, или Интертекст в мире текстов / Н. Фатеева. – М. : Агар, 2002. – 280 с.

79. Фоменко, Л.П. Цитаты в романе М. Булгакова «Белая гвардия» / Л.П. Фоменко // О жанре и стиле советской литературы. – Калинин, 1980. – 134 с.

80. Фуко, М. Слова и вещи / М. Фуко. – СПб. : Academia, 1994. – 406 с.

81. Цейтлин, А.Г. Труд писателя. Вопросы психологии творчества и техники писательского труда / А.Г. Цейтлин. – М. : Совет. писатель, 1968. – 563 с.

82. Чарота, І.А. Пошук спрадвечнай існасці : беларус. літ. у працэсах нац. самавызнач. / І.А. Чарота. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 160 с.

Репозиторий ВГУ

83. Шамякіна, Т.І. Міфалогія і беларуская літаратура / Т.І. Шамякіна. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 391 с.
84. Шкловский, В.Б. Гамбургский счет / В.Б. Шкловский. – М. : Совет. писатель, 1990. – 544 с.
85. Шкловский, В.Б. О теории прозы / В.Б. Шкловский. – М. : Совет. писатель, 1989. – 383 с.
86. Эко, У. Открытое произведение : форма и неопределенность в современной поэтике / У. Эко. – СПб. : Symposium, 2006. – 412 с.
87. Эйхенбаум, Б.М. О литературе : работы разных лет / Б.М. Эйхенбаум. – М. : Совет. писатель, 1987. – 544 с.
88. Элиаде, М. Миф о вечном возвращении : архетипы и повторения / М. Элиаде. – СПб. : Алетейя, 1998. – 249 с.
89. Якобсон, Р.О. Лингвистика и поэтика / Р.О. Якобсон // Структурализм : «за» и «против». – М., 1975. – С. 193–228.
90. Яскевич, А.С. Ритмическая организация художественного текста / А.С. Яскевич. – Минск : Наука и техника, 1991. – 207 с.
91. Яскевіч, А.С. Сумежжа. Мова. Пераклад. Вытокі прозы / А.С. Яскевіч. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 283 с.
92. Яскевіч, А.С. У свеце мастацкага твора / А.С. Яскевіч. – Мінск : Маст. літ., 1977. – 207 с.

## ТЭМАТЫКА І КАРОТКІ ЗМЕСТ ЛЕКЦЫЙНЫХ ЗАНЯТКАЎ

### *Паняцце пра метадалогію літаратуразнаўства*

*Змест тэмы*: 1. Месца і роля метадалогіі ў навуцы пра літаратуру. 2. Метадалогія і методыка. 3. Аналіз літаратурнага твора як катэгорыя метадалогіі. 4. Метад, прынцып і падыход як катэгорыі аналізу. 5. Агульнанавуковыя і прыватнанавуковыя падыходы да аналізу літаратурных твораў.

Метадалогія кожнай навукі вывучае і высвятляе ступень прыдатнасці таго ці іншага шляху разгляду літаратурнага твора для атрымання навуковай ісціны. Задача метадалогіі ў ідэале – даць шляхі аб’ектыўнага вывучэння фактаў. Літаратуразнаўчая метадалогія суадносіць літаратуразнаўчыя веды з унутранымі законамі мастацкай творчасці, а метадалагічная пазіцыя даследчыка канкрэтызуецца з дапамогай паняццяў “аб’ект”, “прадмет даследавання”, “задачы вывучэння”, “прынцыпы”, “метады аналізу”, “прыёмы аналізу” і інш.

Метадалогія існуе і развіваецца ў дзвюх асноўных формах: у канкрэтных работах, якія вывучаюць абраную даследчыкам з’яву; у выглядзе навуковых тэкстаў, якія змяшчаюць апісанне працэдур

Репозиторий ВГУ

аналізу аб’екта. Метадалогія літаратуразнаўства цесна звязана з методыкай навуковага даследавання. Метадалогія навуковага даследавання фармулюе шляхі пазнання, методыка мае прыватны ў адносінах да метадалогіі характар.

Аналіз твора – даследчыцкія дзеянні па навуковым асваенні твора, якія грунтуюцца на пэўных прынцыпах, метадах, падыходах, што вызначаюць накіраванасць і спосабы аналізу літаратурнага твора, паслядоўнасць яго характарыстыкі. Метад ёсць сукупнасць прыёмаў асваення рэчаіснасці, падначаленых вырашэнню канкрэтных даследчыцкіх задач, асобным чынам арганізаваныя формы дзейнасці па вывучэнні твора, якія дэтэрмінуюцца аб’ектам і задачамі даследавання. Метад абапіраецца на пэўныя прынцыпы, што яго канкрэтызуюць. Прынцып – перадумова навуковага пазнання, якое можа быць накіравана на любы аб’ект і праводзіцца ў межах таго ці іншага разумення гэтага аб’екта, таму адзін і той жа зыходны прынцып можа стаць асновай розных метадаў аналізу твора. Падыход – гэта разгляд твора з нейкага аднаго яго боку. З вылучэннем разнастайных аспектаў мастацкага твора як спецыяльных праекцый яго разгляду звязаны розныя падыходы да твора. Звычайна вылучаюць гнасеалагічны, сацыялагічны, эстэтычны, анталагічны, камунікатыўны падыходы да аналізу літаратурных твораў.

*Гнасеалагічны падыход* заснаваны на разглядзе твора як сродку пазнання рэчаіснасці. Сфера інтарэсаў *сацыялагічнага падыходу* – механізмы і працэсы грамадскай абумоўленасці сацыяльнага быцця і функцыянавання літаратурнага твора. *Эстэтычны падыход* – вывучэнне твора як з’явы мастацтва з пункту гледжання яго ўнутранай будовы, адзінства зместу і формы. *Анталагічны падыход* накіраваны на выяўленне спосабу існавання і прыроды літаратурнага твора, ён чыста тэарэтычны па змесце. *Камунікатыўны падыход* бачыць у творы сродак зносін аўтара і чытача, тэксту і чытача. У практыцы навуковага даследавання пералічаныя падыходы найчасцей камбінуюцца.

Існуюць таксама *агульнанавуковыя падыходы*, кожны з такіх падыходаў выдзяляе пэўны план у творы, які часта мае аддаленыя адносіны да мастацкай спецыфікі твора, але ён у нечым аналагічны таму класу з’яў, які вывучае дадзеная дысцыпліна. Да падыходаў такога тыпу перш за ўсё адносяць *сістэмны, кібернетычны, семіятычны, тэарэтыка-інфармацыйны*. З дапамогай агульнанавуковых падыходаў можна праводзіць літаратуразнаўчыя, змешаныя і спецыяльныя даследаванні. Пры характарыстыцы твораў слоўнага мастацтва дастаткова часта выкарыстоўваюцца *прыватнанавуковыя падыходы*, якія разглядаюць твор з пункту гледжання канкрэтнай навукі: лінгвістыкі, міфалогіі, культуралогіі,



Репозиторий ВГУ

этыкі і г.д. Яны апраўданыя, калі сферы інтарэсаў дадзенай навукі важныя ў творы, уваходзяць у яго ўнутраны свет. Вылучаюць таксама *ўнутрылітаратуразнаўчыя падыходы*, што развіваюцца ў межах самога літаратуразнаўства. Яны складваліся гістарычна, на аснове самых розных фактараў. Так, біяграфічны падыход да літаратурнага твора ўзнік у межах біяграфічнага тлумачэння літаратуры. Падыход вызначае агульную стратэгію даследавання, а метад разам з методыкай ёсць канкрэтнае ажыццяўленне падыходу.

### *Міфалагічная школа і яе наступнікі*

*Змест тэмы*: 1. Міфалагічная школа. 2. Рытуальна-міфалагічная крытыка. 3. Міфапаэтыка.

Першай па часе ўзнікнення ў еўрапейскім літаратуразнаўстве стала ***міфалагічная школа.*** Яна нарадзілася ў эпоху еўрапейскага рамантызму, яе філасофскай асновай сталі працы Ф. Шэлінга, А. Шлегеля і Ф. Шлегеля. Ф. Шэлінг сцвярджаў, што міф – неабходны і першасны матэрыял для кожнага віду мастацтва, паводле Ф. Шлегеля, міф – ядро, цэнтр паэзіі. Згодна з меркаваннямі братоў Я. і В. Грымаў, народная паэзія мае Боскае паходжанне, з міфа ў працэсе яго эвалюцыі ўзніклі казка, эпічная песня, легенда і іншыя жанры, а фальклор ёсць бессвядомая і безасабовая творчасць народнай душы. Падобныя з'явы ў фальклоры розных народаў Грымы тлумачылі агульнай для гэтых народаў міфалогіяй, якая брала свае карані з індаеўрапейскіх праміфаў.

Міфалагічная школа ў літаратуразнаўстве XIX стагоддзя прэтэндавала на тлумачэнне ранніх, фальклорных форм мастацкай творчасці, выяўляла міфалагічныя матывы ў казках, былінах, песнях. У кожнай краіне, дзе яна існавала, міфалагічная школа садзейнічала спасціжэнню глыбінных нацыянальных крыніц мастацкай творчасці, закладвала асновы параўнальнага вывучэння міфалогіі, фальклору і літаратуры.

*Рытуальна-міфалагічная крытыка* – метад у заходнееўрапейскім, галоўным чынам англа-амерыканскім літаратуразнаўстве, заснаваны на зблiжэнні літаратуры і іншых відаў мастацтва з міфам і рытуалам. Узнік гэты метад у 1930-х гадах як сінтэз рытуальна-міфалагічнага напрамку ў вывучэнні старажытных культур (Дж. Фрэйзер і Кембрыджская група яго паслядоўнікаў) і аналітычнай псіхалогіі К.Г. Юнга. Праца Фрэйзера грунтавалася на сцвярджэнні прыярытэту рытуалу перад міфам. Паслядоўнікі Фрэйзера распрацавалі тэорыю рытуальнага паходжання антычнага тэатра, гераічнага эпасу, Святой літаратуры Старажытнага Усходу, сярэднявечнага эпасу, казкі, рамана, дзе рытуальна-міфалагічныя



Репозиторий ВГУ

мадэлі галоўным чынам разглядаліся як структура, а не як крыніца паэтычнай фантазіі. У артыкуле “Міф і літаратура” (1961) канадскі даследчык Н. Фрай сфармуляваў сваё разуменне міфа як пэўнага тыпу мастацкага аповеду. Паводле навукоўцы, сучасная літаратура нараджаецца пераважна са старажытнай міфалогіі, а не з “сучаснай эмацыянальнай неабходнасці”. Фрай сцвярджаў абсалютнае адзінства міфа, рытуалу, архетыпа, выводзіў з іх вобразы і жанры, распрацоўваў своеасаблівую літаратурную антрапалогію. Ён суадносіў чатыры фазы прыроднага цыкла, адзначаныя старажытнымі рытуаламі, з міфамі, архетыпамі, вобразамі і жанрамі, арганізаванымі па прынцыпе метафарычнага атаясамлівання ці асацыяцый.

*Міфапаэтыка* грунтуецца на ідэі, што літаратура на наступных стадыях утрымлівае пэўную сістэму міфалагічных мадэлей, міфаструктур, міфалагем, пераасэнсаваных пры ўключэнні іх у новыя структуры, трансфармаваных, ускладненых, дапоўненых рэлігійнымі, эстэтычнымі, навуковымі і іншымі ўяўленнямі пазнейшага часу. Яна часта займаецца вывучэннем мастацкіх сістэм XIX–XX стагоддзяў у галіне жанраў, паэтыкі тэксту, інтэртэкстуальных сувязей, лейтматыўнай вобразнасці, трансфармацыі міфалагічных і фальклорных сюжэтаў, шляхоў і прынцыпаў стварэння сімвалічнай вобразнасці і яе спецыфікі ў мастацкім свеце пісьменніка, асаблівасцей выбару мастацкага хранатопу і выяўлення мастацкай карціны свету, што важна і перспектыўна для асэнсавання спецыфікі літаратурнай творчасці ўвогуле.

Ідэі міфапаэтыкі знайшлі развіццё ў дзейнасці беларускіх літаратуразнаўцаў. Так, В. Каваленка ў кнізе “Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры” сістэматызаваў і абагульніў навуковыя ўяўленні пра міф, прааналізаваў сэнсавыяўленчыя магчымасці выкарыстання міфалагем беларускімі пісьменнікамі XIX–XX стагоддзяў. У даследаваннях Т. Шамякінай істотна канкрэтызуюцца палажэнні міфапаэтыкі пра ўзаемаадносіны міфалогіі і мастацкай літаратуры, а ў працах С. Даніленкі асэнсоўваецца функцыянаванне сацыяльных міфаў у літаратурных творах.

### *Кампаратывізм*

*Змест тэмы*: 1. Роля прац Ф. Шаля і Т. Бенфея ва ўзнікненні і развіцці кампаратывізму. Міграцыйная тэорыя Бенфея. 2. Народна-псіхалагічная школа Х. Штэйнталя і М. Лацаруса. Заснаванне антрапалагічнай тэорыі (Э. Лэнг), тэорыі самазараджэння сюжэтаў. 3. Даследаванне перадумовы запазычванняў А. Весялоўскім. “Гістарычная паэтыка” А. Весялоўскага. 4. Гісторыка-параўнальнае літаратуразнаўства.

Репозиторий ВГУ

Кампаратывістыка пачала актыўна развівацца з другой паловы XIX стагоддзя, яе мэта – высвятленне тыпалагічнай і генетычнай сутнасці літаратурных з’яў (выяўленчых сродкаў, мастацкіх твораў, творчай спадчыны пісьменнікаў, літаратурных школ, жанраў, стыляў і г.д.), раскрыццё ўнутраных заканамернасцей, уласцівых літаратурнай з’яве як гістарычнаму феномену і як літаратурнаму факту, але галоўным чынам без уліку яго канкрэтна-гістарычнай абумоўленасці. Важным этапам у станаўленні кампаратывістыкі стала “тэорыя запазычання” нямецкага ўсходнезнаўцы і санскрытолага Т. Бенфея. Ён выказаў меркаванне пра магчымасць міграцыі сюжэтаў і матываў сярод розных народаў свету не на аснове агульнага паходжання гэтых народаў, а шляхам гістарычна даказаных культурных зносін паміж народамі. Бенфея цікавіў працэс трансфармацыі і распаўсюджвання па ўсім свеце індыйскіх казак і апавяданняў праз шматлікія кантакты з хрысціянскімі народамі. Вучоны пісаў пра перамяшчэнне сюжэтаў гэтых твораў з літаратуры ў народ і ад народа ў літаратуру. Тэорыя запазычанняў Т. Бенфея ўвайшла ў гісторыю літаратуразнаўства як “усходняя”, або “індыйская”.

Паралельна з ідэямі Т. Бенфея існавалі ідэі народна-псіхалагічнай школы Х. Штэйнталя і М. Лацаруса, якія тлумачылі падабенства паэтычных форм так званым адзінствам чалавечай псіхікі. У 1860-я гады ў Англіі ўзнікла антрапалагічная школа (Э.Б. Тэйлар, Э. Лэнг), прадстаўнікі яе пры вывучэнні культуры і быту першабытных народаў сутыкнуліся з фактамі паўтаральнасці многіх форм быту, вераванняў, абрадаў, міфалагічных, казачных сюжэтаў пры мінімальнай верагоднасці якіх-небудзь міжнародных кантактаў і сфармулявалі гіпотэзу аб самазараджэнні сюжэтаў.

Знакаміты рускі вучоны Аляксандр Весялоўскі ўяўляў гісторыю літаратуры гісторыяй грамадскай думкі ў вобразна-паэтычных формах. А. Весялоўскі палемізаваў з еўрапацэнтрысцкай трактоўкай гісторыі літаратуры. Згодна з яго меркаваннямі, кожная культура мае сваю спецыфіку, таму некарэктна гаварыць пра адставанне нееўрапейскіх народаў ад еўрапейскіх, а мадэль развіцця асобных еўрапейскіх літаратур праецыраваць на ўсю сусветную літаратуру. Пры супастаўленні паралельных радоў падобных фактаў вучоны шукаў тыпалагічныя адпаведнасці ў культуры розных “рас” і эпох. Шляхам аналізу мовы паэзіі і прозы Весялоўскі выявіў механізм узнікнення прасцейшых паэтычных формул, супастаўленняў, сімвалаў у слоўнай культуры розных народаў. А. Весялоўскі абмежаваў тэорыю “запазычання” прынцыпамі абавязковага вывучэння быту і светапогляду народа. Вялікую ўвагу рускі вучоны звяртаў на даследаванне перадумоў запазычання сюжэтаў, на сустрэчны рух у літаратуры-рэцыпіенце. Весялоўскі імкнуўся даць класіфікацыю



Рэпазіторый ВДУ

сюжэтаў сусветнай літаратуры, але лічыў, што супастаўляць творы на аснове блізкіх сюжэтаў не варта, бо ў самых падобных сюжэтах ёсць моманты, абумоўленыя нацыянальнай і гістарычнай спецыфікай твора, таму А. Весялоўскі вызначаў матыў як непадзельную адзінку сюжэта, бо падабенства ім тлумачылася не генезісам аднаго матыву ад другога, а магчымасцю агульных матываў, у такой жа ступені абавязковых для чалавечай творчасці, як схемы мовы для выяўлення думкі; творчасць, як сцвярджаў вучоны, абмяжоўваецца спалучэннем дадзеных схем.

Параўнальны метад лёг у аснову параўнальна-гістарычнага літаратуразнаўства, раздзела гісторыі літаратуры, які вывучае літаратурныя сувязі, падабенства і адрозненні паміж літаратурнымі з'явамі ў розных краінах. Прадметам параўнальна-гістарычнага вывучэння таксама выступаюць літаратурныя творы, жанры, стылі, напрамкі.

Параўнальна-гістарычны метад меў шмат прыхільнікаў у XX стагоддзі. Значны ўклад у яго распрацоўку ўнеслі В. Жырмунскі, М. Конрад, М. Аляксееў, І. Неўпакоева, І. Анісімаў, М. Ларчанка, А. Адамовіч, В. Гапава, А. Мальдзіс, В. Каваленка, Г. Тварановіч, М. Тычына і інш., якія ўзбагачалі тэарэтычныя палажэнні кампаратывізму шляхам аналізу ўзаемадачыненняў паміж канкрэтнымі літаратурамі свету, а таксама Д. Дзюрышыні і А. Дзіма, якія спрабавалі абагульніць тэорыю кампаратыўнага вывучэння літаратур свету.

Сучасная кампаратывістыка цесна звязана з этналогіяй, краіназнаўствам, паліталогіяй. Асноўныя напрамкі параўнальнага літаратуразнаўства XXI стагоддзя – гэта кантакталогія (вывучэнне прамых і апасродкаваных кантактных сувязей паміж літаратурамі, куды ўваходзяць вывучэнне ўплываў і запазычанняў, параўнальны аналіз твораў, аўтараў, арыгінала і перакладу ці перакладаў, аналіз цытат, рэмінісцэнцый і алюзій з твораў іншанацыянальных аўтараў; даследаванне генезісу, структуры, функцыянавання твора ў іншанацыянальным асяроддзі), тыпалагічныя сыходжанні, канстанталогія (вывучэнне канстантаў нацыянальнай культуры, трансгістарычных катэгорый, што забяспечваюць пераемнасць нацыянальнай культуры як умовы яе самаідэнтыфікацыі на працягу даволі вялікага часу), імагалогія (вывучэнне духоўнага аблічча народа з пункту гледжання чужой нацыянальнай свядомасці), метакампаратывістыка (вывучэнне гісторыі і сучаснага стану кампаратывістыкі).

Репозиторий ВГУ

### *Культурна-гістарычная школа*

*Змест тэмы*: 1. Погляды І.-А. Тэна на літаратуру і яе даследаванне. Паняцце пра “расу”, “асяроддзе”, “момант”. 2. Моцныя і слабыя бакі культурна-гістарычнай школы. 3. Развіццё ідэй І.-А. Тэна ў даследаваннях навукоўцаў XX ст.

Культурна-гістарычная школа ў літаратуразнаўстве ўзнікла на аснове культурна-гістарычнага метаду, які быў распрацаваны французскім філосафам, гісторыкам і літаратуразнаўцам І.-А. Тэнам у сярэдзіне XIX стагоддзя. Філасофскай асновай культурна-гістарычнага метаду стаў пазітывізм. Літаратура, паводле культурна-гістарычнай школы, – адлюстраванне духу народа ў розныя перыяды яго гістарычнага жыцця, дакумент эпохі. На думку І. Тэна, характар літаратуры вызначаюць “раса”, “асяроддзе” і “момант”, дзе “раса” – гэта прыроджаны тэмперамент, уласцівы індывіду і цэламу народу. Паводле Тэна, “раса” – прыроджаныя і атрыманыя ў спадчыну схільнасці, якія чалавек прыносіць з сабой у свет і якія звычайна суправаджаюцца адрозненнямі ў тэмпераменце і будове цела. “Асяроддзе” для Тэна ёсць мноства дэтэрмінантаў, і асабліва геаграфічныя, гістарычныя, сацыяльныя фактары, якія па сваім значэнні для нацыі роўныя значэнню месца пражывання, выхавання, сям’і, прафесіі, грамадскага становішча для індывіда. “Момант” у Тэна – “гістарычны ўзровень культуры і традыцыя”.

Прыхільнікі і паслядоўнікі Тэна імкнулісяператварыць літаратуразнаўства ў дакладную навуку, якая абапіраецца ў сваіх вывадах на абагульненне багатага фактычнага матэрыялу. Ж.Г. Тард параўноўваў грамадства з мозгам, клеткамі якога выступаюць індывідуальныя свядомасці, што адбіваюцца ў мастацкіх твора, а П. Лакомб акцэнтаваў значнасць псіхалагічных асаблівасцей і грамадска-маральных установак асобы для мастацкага выяўлення рэчаіснасці. Вядомы рускі даследчык А. Пыпін распрацаваў канцэпцыю развіцця літаратуры з народнага быту. Ідэі гэтага выдатнага прадстаўніка рускай культурна-гістарычнай школы знайшлі працяг у працах наступных пакаленняў літаратуразнаўцаў, у тым ліку беларускіх, як паказваюць артыкулы М. Багдановіча, А. Навіны, В. Ластоўскага, “Гісторыя беларускае літаратуры” (1920) М. Гарэцкага, “Очерки истории белорусской литературы” (1920) пад рэдакцыяй М. Янчука, “Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі” (1926) В. Ластоўскага, змястоўныя публікацыі 1920-х гадоў А. Бабарэкі. Ідэі культурна-гістарычнай школы былі развіты ў працах І. Замоціна 1920-х гадоў, які шляхам пераасэнсавання трыяды І.-А. Тэна прапаноўваў пры аналізе літаратурных твораў выкарыстоўваць сінтэз генетычны, фармальна-мастацкі, сацыяльны, ідэалагічны. Неабходнасць уліку

Репозиторий ВГУ

шматгранных сувязей слоўнага мастацтва з нацыянальнымі рэаліямі – адна з канстантаў беларускага літаратуразнаўства.

### *Біяграфічны метад і яго паслядоўнікі*

*Змест тэмы*: 1. Біяграфічны метад. 2. Псіхалагічная школа. 3. Псіхааналіз. Напрамкі псіхааналізу.

*Біяграфічны метад* быў распрацаваны ў эпоху еўрапейскага рамантызму французскім крытыкам і пісьменнікам Ш.-А. Сент-Бёвам. Біяграфія і асоба пісьменніка разглядаліся Сент-Бёвам як вызначальныя моманты мастацкай творчасці. Сент-Бёў раіў і шараговаму, і прафесійнаму чытачу найперш знаёміцца з пісьменнікам праз яго сям'ю, сваякоў, звяртаць увагу на дзяцей, на выхаванне, адукацыю, атачэнне, у якім апынуўся аўтар падчас яго творчага станаўлення. Бясспрэчна, біяграфія пісьменніка адыгрывае значную ролю ў працэсе стварэння мастацкага палатна, але пераўлічэнне ролі біяграфіі творцы непазбежна прыводзіць да пэўнага суб'ектывізму ў вывадах даследчыка, прымушае шукаць аналогіі ў літаратурных творах з момантамі біяграфіі аўтара. Біяграфічны метад з яго акцэнтацыяй ролі пісьменніка-творцы падрыхтаваў станаўленне псіхалагічнага метаду і фрэйдызму (псіхааналітызму). Улік біяграфічных фактаў пры аналізе літаратурных твораў, з пункту гледжання і тэарэтычнага, і практычнага літаратуразнаўства, надзвычай важны для паўнавартаснага разумення створанага пісьменнікам. Метадалогія біяграфістаў творча развівалася беларускімі даследчыкамі В. Атрашкевічам на матэрыяле творчасці айчынных пісьменнікаў пачатку XX стагоддзя і Т. Камароўскай на матэрыяле творчасці амерыканскіх аўтараў XX стагоддзя.

Родапачынальнікамі *псіхалагічнай школы* звычайна называюць нямецкага вучонага В. Вундта, французскага вучонага Э. Энекена і рускага вучонага А. Патабню. Вундт сабраў багаты матэрыял па гісторыі мовы, міфаў і звычаяў, які абагульніў у дзесяцітомнай "Псіхалогіі народаў" (1900–1920). В. Вундт не лічыў псіхалагічнае даследаванне ўніверсальным метадам. На яго думку, праблема вывучэння гісторыі псіхалагічнага развіцця мастацтва заключаецца ў тым, каб выяўляць псіхалагічныя матывы, якія дзейнічалі пры стварэнні мастацкіх твораў. Мастацтва для Вундта – памежжа мовы і міфа, адлюстраванне жыццёвых поглядаў чалавека, якія найперш адбіліся ў міфе і рэлігіі. Выкарыстаннем псіхалагічнага аналізу характарызаваліся працы Э. Энекена, які выказаўся за неабходнасць аб'яднаць эстэтычны і сацыялагічны аспекты пры разглядзе літаратурных твораў, прапанаваў спецыяльны тэрмін "эстапсіхалогія",

Рэпазіторый ВДУ

якім абазначыў літаратурную крытыку, бо крытыка звязвае выяўленне асаблівасцей пэўнага твора з прынцыпамі эстэтыкі, з асобай аўтара, з грамадскім укладам, ва ўмовах якога з'явіўся твор у адпаведнасці з дадзенымі навук пра чалавека, з грамадствам, з эмоцыямі, якія твор здольны нарадзіць у чытачоў. Важнейшай задачай даследчыка літаратуры Энекен называў выяўленне эмоцый, якія выклікаюцца творам і яго мастацкімі сродкамі (мовай, персанажамі, сюжэтам, кампазіцыяй), а таксама высвятленне ўласцівасцей псіхікі мастака, сувязей паміж мастаком і грамадствам. Значны ўклад у распрацоўку псіхалагічнага метаду ўнёс прафесар Харкаўскага ўніверсітэта А. Патабня. Ён распрацаваў вучэнне пра ўнутраную форму слова, заснаваную на ідэі В. фон Гумбальдта, што мова – гэта не стабільная дадзенасць, а неперарыўны творчы працэс, што ўнутраная форма слова ёсць выяўленне светасузірання народа, якое складваецца пад уплывам геаграфічных і гістарычных рэалій. У Гумбальдта А. Патабня пазычыў думку пра дамінаванне ў мове ўнутранай формы. Патабня адзначаў, што слова-вобраз фіксуе не змест, а ўказанне на змест, дае не ідэю, а намёк на ідэю, што вобраз не прама выяўляе думку, што вобраз – сродак стварэння думкі і пры гэтым для чытача ён з'яўляецца сродкам самапазнання. Нават самы высокі ўзровень таленту і інтэлекту, лічыў навукоўца, не зможа прадказаць рэакцыю чытача, таму аўтар не мае ўпэўненасці, што яго думкі будуць адэкватна ўспрыняты чытачом. Патабня метафарычна параўноўваў слова са стрэлачнікам на чыгунцы, які пераводзіць цягнік на рэйкі, а ўспрыманне слова – з разгараннем адной свечкі ад другой.

Псіхалагічная школа імкнулася раскрыць спецыфіку стварэння і ўспрымання мастацкага твора з апорай на псіхалогію творцы і чытача. Прыхільнікаў псіхалагізму перш за ўсё цікавілі адносіны "аўтар – твор" і "твор – чытач", суб'ектыўны бок аўтарскай працы спасцігаўся ў залежнасці ад душэўнага складу і жыццёвага вопыту творцы. Навукоўцы XX стагоддзя шмат увагі надавалі вывучэнню псіхалогіі творчасці. Яна грунтоўна даследавалася ў працах П. Мядзведзева (фактычна М. Бахціна. – *В.Б.*), А. Кавалёва, А. Цэйтліна, Г. Лянобля, Б. Мейлаха і інш. Вывучэннем псіхалогіі творчасці займаліся беларускія літаратуразнаўцы А. Яскевіч, А. Матрунёнак і некаторыя іншыя.

*Псіхааналітызм* заснаваны на трактоўцы літаратурнага твора ў адпаведнасці з вучэннем псіхалогіі пра бессвядомае, ён разглядае літаратурную творчасць як сублімаванае сімвалічнае выяўленне адпачатковых псіхічных імпульсаў і захапленняў, што некалі адрынула рэальнасць, а потым гэтыя псіхалагічныя імпульсы і захапленні знайшлі кампенсаторнае ўвасабленне ў фантазіі творчай асобы. Псіхааналітычная тэорыя аўстрыйскага ўрача і псіхолага З. Фрэйда, якая садзейнічала развіццю псіхааналітызму ў



Рэпазіторый ВДУ

літаратуразнаўстве, замяняла аб'ектыўныя сацыяльна-эканамічныя катэгорыі суб'ектыўна-псіхалагічнымі і біялагічнымі. Падсвядомае, інтуітыўнае тлумачылася Фрэйдам з пункту гледжання сексуальнага жыцця чалавека. Мастацкая творчасць, па З. Фрэйду, – выяўленне эмацыйных станаў, часцей за ўсё генетычна звязаных з дзіцячымі сексуальнымі захапленнямі. Ранняя фрэйдысцкая тэорыя бессвядомага прымушала літаратуразнаўцаў аднабакова тлумачыць разнастайнасць літаратурных твораў праявамі галоўным чынам эдыпавага комплексу. Псіхааналітызм у літаратуразнаўстве спрабаваў выявіць у мастацтве слова ўстойлівыя сюжэтныя схемы, дзе аўтар-пісьменнік нібыта ідэнтыфікуе сябе з героем і падае выкананне сваіх падсвядомых жаданняў, або трагічнае сутыкненне сваіх жаданняў з сіламі сацыяльнай і маральнай забароны.

Швейцарскі псіхолаг і філосаф К.Г. Юнг абапіраўся на ідэю пра дамінаванне бессвядомага над свядомым, але не пагаджаўся з перавелічэннем ролі сексуальных захапленняў у жыцці чалавека. Для Юнга бессвядомае – уласцівая ўсім людзям спадчына мінулага, прыроджаная псіхалагічная структура, што з'яўляецца акумулятарам вопыту, які падсвядома перадаецца з пакалення ў пакаленне. Калектыўнае бессвядомае звязвалася Юнгам з біялагічным механізмам спадчыннасці, у якім вучоны выявіў архетыпы бессвядомага. К.Г. Юнг называў архетып асноўным элементам калектыўнага бессвядомага, своеасаблівай скарбонкай найбольш каштоўнага і глыбіннага чалавечага вопыту, які спасцігаецца і рэалізуецца ў мастацкай творчасці шляхам выкарыстання першапачатковых вобразаў.

Псіхааналітычны метад, такім чынам, існуе ў дзвюх разнавіднасцях: фрэйдысцкі псіхааналіз, дзе ключавыя паняцці "лібіда", "свядомае"/"бессвядомае", "эдыпаў комплекс", "комплекс непаўнавартаснасці", "яно", "звыш-Я", "Я", "згушчэнне", "змяшчэнне" і інш., накіраваны на выяўленне біяграфічнай падасновы мастакоўскай дзейнасці; і псіхааналіз Юнга (архетыпны метад), дзе ключавыя паняцці "адкрытае"/"замкнутае", "унутранае"/"знешняе", "мужчынскае"/"жаночае", "маладое"/"старое", "розныя стыхіі" і г.д.), накіраваны на даследаванне не індывідуальнай, а нацыянальнай і агульначалавечай падсвядомасці ў яе нязменных вобразных формах – архетыпах, калі ў цэнтры знаходзіцца не асоба творцы, а звышасабовая пазасвядомасная сімволіка.

***Фенаменалагічны метад***

*Змест тэмы*: 1. Фарміраванне метаду і школы ў 1920–1930-х гг. 2. Канцэпцыя структурных пластоў, яе развіццё нямецкімі (М. Гейгер, А. Гергер, І. Пфайфер) і польскімі (Р. Інгардэн, Ю. Клейнер)



Репозиторий ВГУ

навукоўцамі. 3. Эвалюцыя фенаменалагізму. Крытыка свядомасці, школа крытыкаў Бафала, рэцэптыўная крытыка.

Фенаменалогія – вучэнне пра феномены, або прадметы ў пачуццёвым успрыманні. Яе важнейшыя палажэнні былі распрацаваны нямецкім філосафам і матэматыкам Э. Гусерлем. Даследчыцкая метадалогія Э. Гусерля заключалася ў абстрагаванні даследуемага аб’екта ад прадметаў рэальнага свету і суб’ектыўных псіхалагічных актаў, у разглядзе феномена самога па сабе, але падзеленага на структурныя элементы. Для фенаменолагаў эстэтычны прадмет – цэласнасць, дзе вылучаецца шэраг анталагічных пластоў, а таму гэтая цэласнасць функцыянуе адначасова як носьбіт ідэальнага сэнсу і як набор успрынятых пачуццямі прыкмет. Метад выяўлення пластоў у фенаменалагічным апісанні быў упершыню выкарыстаны самім Э. Гусерлем, які пабудаваў мадэль паслойнай структуры аб’екта, што ўспрымаецца свядомасцю, дзе пласты структуры, у якой кожны пласт паасобку ўяўляе сабой незалежную адзінку, разам утвараюць цэласную структуру.

Першая спроба прыстасаваць фенаменалогію да літаратуразнаўства і філасофіі мастацтва была зроблена ў 1908 годзе нямецкім вучоным В. Конрадам. Ён абраў аб’ектам фенаменалагічнага даследавання “эстэтычны аб’ект”, адмежаваў яго ад аб’ектаў фізічнага свету, звёў эстэтычны аналіз да выяўлення толькі аднаго элемента – “слоўнага знака”.

Дэталёва распрацаваная Э. Гусерлем канцэпцыя ўзроўняў (пластоў) была выкарыстана нямецкімі даследчыкамі (М. Гейгерам, А. Пергерам, І. Пфайферам) і польскімі (Р. Інгардэнам, Ю. Клейнерам), эстэтыкамі і літаратуразнаўцамі для вырашэння пытання аб спосабе быцця літаратурных твораў і для параўнання структуры літаратурных твораў са структурай твораў іншых відаў мастацтва. Важкі ўклад у развіццё фенаменалогіі ўнёс польскі вучоны Раман Інгардэн. У якасці аб’екта даследавання Інгардэн абраў літаратурны твор, інтэнцыйны характар якога, паводле вучонага, відавочны. Асноўная праца Р. Інгардэна – “Літаратурны твор мастацтва” (1931), дзе была прадстаўлена мадэль шматслойнай структуры слоўнага мастацкага твора. Інгардэн вылучыў у абстрактнай мадэлі твора чатыры неаднародныя функцыянальныя пласты, якія не парушаюць цэласнасць твора. Першы пласт – пласт “слоў-знакаў”, пласт гучання, да якога належаць і больш складаныя гукавыя ўтварэнні (сказ, часткі сказа). Гэта структура не самастойная, бо з дапамогай гукаў узнаўляецца другі структурны пласт – “семантычных адзінак”, якія фарміруюць стыль твора (у Інгардэна яны не адносяцца да індывідуальнай свядомасці). Трэці пласт

Репозиторий ВГУ

структуры твора складаецца з “адлюстраваных прадметнасцей”. Тут Р. Інгардэн выходзіў за межы гусерліянскай фенаменалогіі, бо прызнаваў сувязь “прадметнасцей” з аб’ектыўнай рэальнасцю, іх змястоўнасць. Чацвёрты пласт структуры літаратурнага твора – пласт “схематызаваных наглядных вобразаў”, якія надаюць “прадметнасці” эстэтычную каштоўнасць. Пры раскрыцці структуры твора Інгардэн не імкнуўся выявіць яго ідэю, бо яна звязана са знешнім светам.

Асноўным падыходам германскага фенаменолага-экзістэнцыйнага падыходу да аналізу літаратуры з’яўляўся разгляд мастацкага твора як замкнутага ў сабе “дасканалага” выяўлення чалавекам сваіх уяўленняў; усведамленне таго, што твор мастацтва выконвае сваё прызначэнне самім фактам свайго існавання, бо выяўляе асновы чалавечага быцця. У французскіх вучоных (М. Дзюфрэн, М. Мерло-Панці і інш.) фенаменалагічнае апісанне найчасцей суправаджалася выяўленнем архетыпаў як першасных феноменаў, або комплексных вобразаў, дамінантных для пісьменніка ці пэўнай нацыянальнай літаратуры. Так, Г. Башляра цікавілі агульныя архетыпы, якія індывідуальна праяўляліся ў канкрэтнай паэтычнай фантазіі. На думку вучонага, творчая асоба фарміруецца пад уплывам бессвядомага, а яно адбіваецца ў тыпе ўяўлення, што ўвасабляецца ў вобразнай сістэме аўтара, дзе заўважаецца перавага пэўнай субстанцыяльнай асновы (паветра, вады, зямлі, агню), а таксама выяўляюцца спецыфічныя камбінацыі і трансфармацыі вобразаў пэўнай матэрыяльнай сферы, якія дэтэрмінуюцца творчым характарам уяўлення.

Метадалагічныя прынцыпы фенаменалагічнага аналізу літаратурнага твора, такім чынам, грунтаваліся на тым, што фенаменалогія – навуковы метад, які разглядае феномен па-за кантэкстам, толькі зыходзячы з яго самога. Складаныя феномены раскладаліся на састаўныя часткі, узроўні, пласты, тым самым выяўлялася структура феномена. Найбольшую папулярнасць атрымала ідэя фенаменалагістаў пра мастацкі твор як адзінае цэлае: усё, што можна даведацца пра твор, заключана ў самім творы, твор мае самастойную каштоўнасць, сваё аўтаномнае існаванне, пабудаваны па ўласных законах.

З пачатку 1970-х гадоў у літаратуразнаўстве ЗША наглядалася захапленне фенаменалагічным метадам пазнання, якое перарасло пасля ў захапленне германеўтыкай і рэцэптыўнай эстэтыкай. Актуальнымі для амерыканскай крытыкі сталі разнавіднасці рэцэптыўнай эстэтыкі, якая займалася аналізам адносін “твор–аўтар”, і Жэнеўскай школы, якая выяўляла адносіны “аўтар–твор”. У ЗША ў рэчышчы фенаменалагічнай і германеўтычнай метадалогіі існавалі тры школы: крытыка свядомасці, школа крытыкаў Бафала,



Рэпазіторый ВДУ

рэцэптыўная крытыка, або школа рэакцыі чытача. Прадметам даследавання ва ўсіх трох выступаюць феномены свядомасці. Крытыка свядомасці разглядае тэкст як выяўленне свядомасці аўтара, якую містычна падзяляе чуйны чытач; як аб’ект, што не можа быць адарваны ад мэтанакіраванай волі стваральніка і рэцыпіента. Па іх версіі, літаратурны твор – узнаўленне пэўнага душэўнага стану, “модус свядомасці”, народжаны спалучэннем слоў і думак як сродку іх выяўлення, а літаратурная крытыка – усведамленне свядомасці аналізуемага пісьменніка; паколькі знешняе меркаванне пра твор мастацтва ўступае месца ўнутранаму ўдзелу ў чыста суб’ектыўным працэсе пазнання гэтага твора, то крытык як бы дапаўняе твор, надае яму дасканаласць і закончанасць. Крытыкі школы Бафала сцвярджалі, што чытач афармляе і дэтэрмінуе тэкст у адпаведнасці са сваёй індывідуальнасцю. Школа крытыкаў Бафала факусіравала ўвагу на падсвядомасці чытача, які ўспрымае тэкст. Яна выкарыстоўвала метады “эга-псіхалогіі”, базісныя прынцыпы псіхааналізу як сродку разумення прыроды літаратурнага ўздзеяння. Рэцэпцыяністы разглядалі тэкст у якасці своеасаблівага “кантралёра” працэсу водгукаў чытача. Мэта амерыканскай рэцэптыўнай крытыкі – дакладнае апісанне паслядоўнага ўспрымання чытачом тэксту, якое развіваецца ў часе; фіксаванне водгукаў свядомасці чытача ў акце чытання. Для рэцэптыўнай крытыкі літаратурны твор – працэс, што развіваецца, ствараецца ў акце ўспрымання пры чытанні, а твор атрымлівае сваё значэнне толькі ў выніку ўзаемадзеяння друкаванага тэксту з работай свядомасці чытача-рэцыпіента.

### ***Герменеўтыка***

*Змест тэмы*: 1. Герменеўтыка як навуковы напрамак у гуманітарных навуках. 2. Тэхніка рэканструкцыі, “герменеўтычнае кола” Ф. Шлеермахера. 3. Перанос інтэрпрэтацыі з філалогіі ў гісторыю. 4. Погляды на герменеўтыку Г.Г. Гадамера. 5. Рэцэптыўная эстэтыка. 6. Гісторыка-функцыянальнае літаратуразнаўства.

Герменеўтыка – вучэнне пра прынцыпы інтэрпрэтацыі тэкстаў, “мастацтва” разумення і тлумачэння тэкстаў. Яе функцыя – навучыць разумець твор мастацтва ў адпаведнасці з яго абсалютнай мастацкай каштоўнасцю. Інструментам пазнання тут лічыцца свядомасць асобы рэцыпіента твора, а інтэрпрэтацыя выводзіцца з успрымання літаратурнага твора. “Бацькам сучаснай герменеўтыкі” называюць нямецкага філолага эпохі рамантызму Ф.Д.Э. Шлеермахера, які бачыў прызначэнне герменеўтыкі ў разуменні чужой індывідуальнасці, у спасціжэнні духоўнага свету аўтара ў акце творчасці. Паслядоўнік Ф.Д.Э. Шлеермахера В. Дыльтэй сцвярджаў, што разуменне ўласнага



Репозиторий ВГУ

свету дасягаецца шляхам інтраспекцыі, разуменне чужога – шляхам "ужывання", "суперажывання", "учування", а разуменне з'яў культуры мінулага – шляхам тлумачэння іх як праяў цэласнага духоўнага жыцця гістарычнай эпохі. Дыльтэй распрацаваў стрыжнёвае для сучаснай герменеўтыкі паняцце "рэцэпцыя". Ён прапанаваў аналізаваць творы мастацтва з улікам злітнасці "эпохі", "гістарычнага духа" і "псіхічнага духа" (духоўнай цэласнасці індывіда).

У канцы 1920-х гадоў у асяроддзі паслядоўнікаў Ф.Д.Э. Дыльтэя вылучыліся два напрамкі: "гісторыя стылю" (Ф. Гундальф, Ф. Штрых, Э. Бертрам, Г. Цызарыц) і "гісторыя ідэй" ("праблемна-гістарычны напрамак" Р. Унгера, Ю. Петэрсена, Г. Корфа). Нямецкі філосаф-экзістэнцыяліст М. Хайдэгер імкнуўся ачысціць тэорыю разумення тэксту ад суб'ектывізму і псіхалагізму, каб дапамагчы індывіду выявіць сэнс існавання, знайсці сябе ў жыцці. Акт разумення, на думку Хайдэгера, заўсёды ажыццяўляецца ў межах так званага "герменеўтычнага кола", паняцця, распрацаванага Ф.Д.Э. Шлеермахерам, дзе цэлае нельга зразумець без разумення частак, а разуменне часткі мае на ўвазе, што цэлае ўжо зразумета. Вучань М. Хайдэгера Г.Г. Гадамер у даследаванні "Ісціна і метад. Асновы філасофскай герменеўтыкі" (1960) разглядаў герменеўтыку як вучэнне пра быццё ў анталагічным плане. Паводле Гадамера, інтэрпрэтацыя пачынаецца з папярэдняга разумення, якое вызначаецца традыцыяй. Яно карэкціруецца і паглыбляецца ў працэсе аналізу тэксту і вядзе да "зліцця даляглядаў" тлумачальніка і аўтара тэксту, розных з прычыны гістарычнай дыстанцыі, аднак гэтая розніца мае месца толькі на пачатковай стадыі разумення тэксту.

Літаратуразнаўчая герменеўтыка ўключае выпрацоўку гіпотэзы, у якой змяшчаецца прадчуванне і перадразуменне сэнсу тэксту ці нейкага цэлага; інтэрпрэтацыю на аснове сэнсу асобных фрагментаў тэксту, інакш кажучы, зваротны рух ад цэлага да частак, карэкціроўку цэласнага сэнсу на аснове аналізу асобных фрагментаў тэксту, зваротны рух ад частак да цэлага.

Герменеўтычныя прынцыпы канкрэтызуюцца ў ***рэцэптыўнай эстэтыцы***. Прыхільнікі рэцэптыўнай эстэтыкі ўлічваюць уплыў на ўспрыманне літаратурных твораў не толькі псіхалагічных і індывідуальных эмацыянальных асаблівасцей розных рэцыпіентаў, але і ўздзеянне эпохі, гістарычнай сітуацыі, нацыянальнай культуры і г.д. Згодна з ідэямі рэцэптыўнай эстэтыкі, літаратурны твор шматаблічны ў сінхронным і ў дыяхронным планах ва ўздзеянні на аўдыторыю. Для рэцэптыўнай эстэтыкі твор і рэцыпіент – аднолькава значныя і дзейсныя бакі рэалізацыі мастацкага зместу. Мастацкі сэнс у рэцэптыўнай эстэтыцы перастае ацэньвацца толькі як характарыстыка тэксту, як нешта пастаянна звязанае з дадзеным

Рэпазіторый ВДУ

тэкстам, твор разглядаецца як гістарычна бясконцая з’ява, ранейшая каштоўнасць, і сэнс якой мяняюцца. Найбольш паслядоўна ідэі рэцэптыўнай эстэтыкі былі сфармуляваны ў працы прафесара Канстанцкага ўніверсітэта (ФРГ) Г.Р. Яуса “Гісторыя літаратуры як выклік тэорыі літаратуры” (1970).

Сучасная рэцэптыўная эстэтыка аналізуе “гаворачыя” назвы (часта яны ўключаюць імя героя, праграмна-рытарычнае пытанне, складаны аксюмаран і г.д.); эпіграфы; спецыяльныя аўтарскія заўвагі; пастскрыптумы; апавядальніцкі зачын, уступ, першую фразу, якая настройвае чытача на ўспрыманне твора; месца і час дзеяння, якія вызначаюць характар рэалій (канкрэтна-гістарычных, эканамічных, геаграфічных, бытавых і г.д.); формы прысутнасці чытача ў тэксце, закліканыя актывізаваць яго ролю як удзельніка мастацкай падзеі: непасрэдныя звароты аўтара да чытача, прадбачанне яго чаканняў і рэакцый, узнаўленне яго слова, спасылкі на яго вопыт ці ўяўленні, уключэнне яго ў падзеі як персанажа.

*Гісторыка-функцыянальнае літаратуразнаўства* – усходнееўрапейскі варыянт рэцэптыўнай эстэтыкі. Яго метадалогія выпрацоўвалася ў навуковых работах А. Весялоўскага, А. Бялецкага, М. Бахціна, Д. Ліхачова, Я. Мукаржоўскага, Ф. Водзічкі і іншых вучоных. Тэрмін “гісторыка-функцыянальнае літаратуразнаўства” прапанаваў у 1970-я гады акадэмік М. Храпчанка. Яшчэ М. Бахцін у першай палове мінулага стагоддзя слушна падкрэсліваў, што жыццё і функцыянаванне літаратурнага твора ў стагоддзях – бясконцы ланцуг творчай практыкі, у тым ліку і навукова-даследчай; працэс судакранання розных эпох і культур і адпаведных ім сацыяльна-ідэалагічных пераакцэнтуацый. Бахцін доказна пісаў пра дынамічную зменлівасць цікавасці чытачоў да літаратуры мінулага, разважаў пра прычыны ваганняў рэпутацый пісьменнікаў, ацэнак іх творчасці ў блізкім і далёкім часе. М. Бахцін, Ю. Бораў, Г. Паспелаў, П. Паліеўскі, калі гаварылі пра заканамернасць адкрыцця кожным новым пакаленнем у творах мінулага новага зместу, прыходзілі да высновы, што працэс пераасэнсавання залежыць ад здольнасці новага пакалення даследчыкаў убачыць па-новаму структуру твора. Гісторыка-функцыянальнае літаратуразнаўства засяроджана на вывучэнні сукупнасці інтэрпрэтацый літаратурных твораў, твора і працэсу яго функцыянавання ў розныя гістарычныя эпохі.

### ***Фармальны напрамак***

Змест *тэмы*: 1. ОПОЯЗ. 2. Неакрытыцызм. 3. Структуралізм. 4. Генератыўная паэтыка.

Фармальны напрамак быў дастаткова прадуктыўным у літаратуразнаўстве XX стагоддзя. Ён прадстаўлены рознымі



Репозиторий ВГУ

даследчыцкімі школамі і плынямі, для ўсіх іх характэрна прызнанне дамінуючай ролі формы ў літаратурным творы, прынцып закрытага прачытання тэксту.

*ОПОЯЗ* – адна з першых па часе ўзнікнення школ канцэптуальнага даследавання формы літаратурных твораў. Яе прадстаўнікі з'яўляліся апанентамі распаўсюджанага ў пачатку XX стагоддзя ўяўлення пра літаратуру як крыніцу для вывучэння грамадскай свядомасці і культурна-гістарычнай панарамы эпохі. Маладыя вучоныя Масквы і Пецярбурга аб'ядналіся прыкладна ў 1915 годзе ў ОПОЯЗ ("Общество по изучению поэтического языка"), ініцыятарам стварэння якога выступіў В.Б. Шклоўскі. ОПОЯЗаўцы зацікавіліся ідэямі нямецкага вучонага О. Вальцэля пра літаратурны твор як канструкцыю на аснове слоўнага адзінства, пра неабходнасць для паэтыкі арыентавацца на лінгвістыку, выяўляць "вышэйшую матэматыку формы": размяшчэнне гукавых частак, дамінаванне пэўных часцін мовы, пэўных граматычных катэгорый і г.д. Дзеля папулярызацыі ідэй Вальцэля В.М. Жырмунскі пераклаў работы нямецкага вучонага на рускую мову. На станаўленне і развіццё фармальнага метаду істотна паўплывала незаконченая работа А.М. Весялоўскага "Паэтыка сюжэтаў", у прыватнасці, прапанаваныя Весялоўскім азначэнні "сюжэта" і "матыву", дзе сюжэт разглядаўся як элемент кампазіцыі, а не як момант тэматыкі. Адсюль бярэ пачатак размежаванне фармалістамі паняццяў "прыём" і "матэрыял". У адносінах да сюжэта гэтае адрозненне прадставала як антыномія "сюжэта" і "фабулы". В.Б. Шклоўскі падкрэсліваў, што размежаванне знешніх момантаў (матэрыял) і ўнутраных (форма) вызначае самакаштоўнасць літаратуры, палемізаваў з вывадам А.А. Патабні наконт метафарычнасці (сімвалічнасці) слова. Шклоўскі не пагаджаўся са сцвярджэннем, што літаратура – мысленне вобразамі і падкрэсліваў, што вобразы практычна нерухомыя, а работа паэтычных школ зводзіцца да назапашвання і выяўлення новых прыёмаў размяшчэння і апрацоўкі слоўных матэрыялаў. Паэтычнае маўленне фармалісты проціпастаўлялі паўсядзённаму маўленню, літаратурнасць для іх – сістэма прыёмаў, якая забяспечваеператварэнне маўлення ў паэтычны твор. "Прыём" – цэнтральнае паняцце для фармалістаў, знакаміты артыкул В. Шклоўскага называўся "Мастацтва як прыём" (1916). ОПОЯЗ акцэнтаваў ідэю сістэмнасці літаратурнага твора. Дзякуючы сістэмнаму падыходу фармалістаў пашырыўся погляд на літаратурны рад (кантэкст. – *В.Б.*), які даследчыкі пачалі суадносіць з іншымі радамі.

*"Новай крытыкай"* звычайна называюць розныя метадалагічныя школы і плыні, што адмаўляліся ад прыёмаў біяграфічнага, псіхалагічнага, сацыяльнага аналізу твораў. Годам нараджэння "новай

крытыкі” многія навукоўцы лічаць 1911, калі ўбачыла свет аднайменная работа амерыканскага даследчыка Дж.Э. Спінгарна, другія бачаць яе вытокі ў працах пачатку трэцяга дзесяцігоддзя XX стагоддзя, трэція – вядуць адлік яе гісторыі з сярэдзіны 1950-х гадоў.

Значная роля ў распрацоўцы метадалогіі “новай крытыкі” перш за ўсё належыць англа-амерыканскай школе, падрыхтаванай працамі Дж.Э. Спінгарна і Т.С. Эліёта. У лекцыі “Новая крытыка” (1911) Спінгарн сцвярджаў, што мастацтву не патрэбны знешнія меркі, што добры густ здольны ўзнавіць твор мастацтва, зразумець і ацаніць яго. Англійскі паэт, драматург і крытык Т.С. Эліёт выказаў ідэю пра існаванне так званага аб’ектыўнага карэлята, пра лінгвістычную рэалізацыю мастацкай структуры твора. Эліёт даказваў, што мастацтва пазбаўлена “дэспатызму эмоцыі”, таму мастацкія творы ён разглядаў ізалявана ад асобы аўтара і грамадска-гістарычных фактараў. Яркі прадстаўнік англійскай “новай крытыкі” – П. Лебак, аўтар кнігі “Майстэрства прозы” (1921), які даследаваў праблему “пункту погляду”, падымаў яе да ўзроўню мастацкага метаду. Англійскі шэкспіразнаўца Дж.У. Найт не ва ўсім прытрымліваўся пазіцый “новай крытыкі”. Інтэрпрэтацыя, паводле Найта, павінна раскрыць унутраны сэнс твора, спасцігнуць значэнне яго сімволікі. Дастаткова часта сімвалічная інтэрпрэтацыя ў Найта не дапаўняе веды чытачоў пра твор, а з’яўляецца канчатковай мэтай. Прыклад таму – аналіз Найтам п’есы В. Шэкспіра “Бура” і яго вывад, што ў творы сюжэт будуецца на аснове буры, а не бура ўводзіцца ў сюжэт.

У ЗША “новая крытыка” сфарміравалася ў 1930-х гадах пад уплывам англійскай. Час росквіту амерыканскай “новай крытыкі” – 1940–1950-я гады. Яе тэарэтычныя асновы сфармулявалі А. Тэйт (“Рэакцыйныя эсэ аб паэзіі і ідэях”, 1936), К. Брукс (“Сучасная паэзія і традыцыя”, 1939), Дж.К. Рэнсам (“Плоць свету”, 1939; “Новая крытыка”, 1941), Р.П. Блэкмур (“Мова як жэст”, 1952), У.К. Уімсэт (“Слоўны лік”, 1954), дзе галоўнай задачай навукі пра літаратуру называлася скрупулёзнае даследаванне тэксту, выяўленне канкрэтнага і адначасова ўсеагульнага сэнсу тэксту, значнасці метафар, параўнанняў, увогуле вобразнай сістэмы. Асаблівая ўвага надавалася расшыфроўцы сімволікі ў тэксце, якая адлюстроўвае глыбінныя матывы чалавечых паводзін (“Філасофія літаратурнай формы. Даследаванне сімволікі дзеянняў” К. Бёрка, 1941), выяўленне шматзначнасці сэнсу паэтычнага твора, інтэрпрэтацыя стылю як пэўнага светабачання.

“Новая крытыка” ў Францыі аб’ядноўвала розныя напрамкі ў сярэдзіне 1950-х гадоў. Прыкметнай фігурай у “новай крытыцы” Францыі ў 1960-х гадах стаў Ралан Барт, які стварыў тэорыю “пісьма”, прапанаваў тэорыю “сацыя-логікі” як гістарычнай сістэмы духоўнай

Рэпазіторый ВДУ

вытворчасці, што раскрывае сацыякультурны сэнс літаратурных твораў. З сярэдзіны 1960-х гадоў сталі распаўсюджвацца структуралісцкія тэндэнцыі, звязаныя з задачамі пабудовы агульнай паэтыкі (артыкул “Паэтыка” Ц. Тодарава, 1968), тэорыі сюжэтаскладання і апавядання (А.Ж. Грэймас, К. Брэмон, Ц. Тодараў, Ж. Жэнет) і “неарыторыкі” (група “μ(мю)”, П. Гіро).

*Структуралізм* паставіў за мэту перавесці гуманітарныя навукі з апісальна-эмпірычнага на абагульнена-абстрактны ўзровень. Структуралісты прапанавалі сваё разуменне структуры, дзе структура – гэта сістэма адносін у аб’екце, якія застаюцца інварыянтнымі пры ўсіх ператварэннях пэўнага тыпу, а самі ператварэнні – правілы, што дазваляюць пераходзіць ад інварыянта да варыянтаў і ад аднаго варыянта да другога. Вызначальнай рысай структуралізму з’яўлялася імкненне за свядомым “маніпуляваннем” знакамі, вобразамі, сімваламі, ажыццяўляемымі чалавекам, выявіць бессвядомыя, “глыбінныя” структуры семіятычных сістэм, іх схаваныя механізмы, якія рэгулююцца сацыякультурнай або ўніверсальнай логікай чалавечых паводзін і мыслення. Складнікі структуры разглядаліся як функцыі, згодна з традыцыяй, закладзенай яшчэ рускімі фармалістамі.

Структуралізм праблематызаваў паняцце “літаратура”, распрацаваў паняційны апарат, прыстасаваны для вывучэння структуры – сукупнасці ўстойлівых адносін, якія забяспечваюць захаванне асноўных уласцівасцей аб’екта. Структуралісты карысталіся такімі тэрмінамі, як “адносіны”, “элемент”, “узровень”, “апазіцыя”, “становішча”, “варыянт”, “інварыянт”, дзе “адносіны” – сувязь паміж элементамі, пры якой мадыфікацыя аднаго элемента выклікае мадыфікацыю іншых; “элемент” – непадзельная далей у межах абранага спосабу вывучэння частка даследуемага аб’екта. З паняццем “структуры” цесна звязана паняцце “ўзроўню”, на якім вядзецца даследаванне аб’екта, “узровень” – аднапарадкавасць элементаў, звязаных адносінамі, ці аднапарадкавасць адносін у структуры элемента. Узроўні вылучаюцца на аснове “апазіцыі” – бінарнага становішча супрацьпастаўленых элементаў ці радоў адносін у структуры аб’екта. “Апазіцыя” – гэта адлюстраванне становішча – размяшчэння элементаў ці радоў адносін у яго структуры. Структура – асноўная ўласцівасць аб’екта – яго інварыянт – абстрактнае абазначэнне адной і той жа сутнасці, узятай адасоблена ад яе канкрэтных мадыфікацый – варыянтаў. Мадыфікацыі ў мастацкім тэксце, паводле структуралістаў, могуць быць прасочаны або праз выбар аўтарам тэксту аднаго з сінанімічных элементаў (вось выбару, вертыкальная вось, парадыгматыка), або праз спалучэнне элемента з папярэднімі і наступнымі за ім элементамі (спалучэнні, гарызантальная вось, сінтагматыка).



Рэпазіторый ВДУ

Паводле структуралістаў, назапашванне пэўнай сумы ведаў адносна асобнай групы фактаў чалавечага быцця можа адкрыць код, які дазволіць спасцігнуць таямніцы пазнання. Навукоўцы аперыравалі ўніверсальнымі катэгорыямі, прымяняльнымі да любога тэксту. Структуралісты спрабавалі стварыць тыпалогію апавядальніцкіх канструкцый, выявіць віртуальныя апавядальніцкія магчымасці, распрацаваць апавядальніцкую “граматыку”, звод “тэхнічных” правіл, заснаваны на камбінаванні абстрактных перманентных структур. Усе з’явы, даступныя пачуццёваму, эмпірычнаму ўспрыманню, разглядаліся імі як знешнія праявы (“маніфестацыя”) унутраных, глыбінных структур. Непасрэдна задача структурнага аналізу фактычна заключалася ў вызначэнні ўнутраных заканамернасцей пабудовы твора, якія адлюстроўваюць абстрактна-родавыя прыкметы і рысы, што нібыта ўласцівыя ўсім літаратурным тэкстам, незалежна ад канкрэтнага зместу гэтых тэкстаў, або – на яшчэ больш высокім узроўні абагульнення – у апісанні, як зазначаў Барт, працэсу фарміравання сэнсу, таму Барт заклікаў шукаць адзіную апавядальніцкую мадэль, Р. Скоўлз – устанавіць мадэль самой літаратуры, Дж. Калер – адкрыць і зразумець сістэмы канвенцый, якія робяць магчымым існаванне літаратуры.

Адзін з самых вядомых прадстаўнікоў савецкага і постсавецкага структуралізму Ю. Лотман даказваў правамернасць погляду на твор мастацтва як на мадэль рэчаіснасці з уласцівасцямі, што дазваляюць увогуле вызначыць спецыфіку мастацтва. Па Лотману, мадэль у мастацтве ўтрымлівае ў сабе больш шырокія магчымасці непрадбачаных адкрыццяў, чым навуковая мадэль. Ю. Лотман папулярызаваў паняцце “кантэкст”, які ў канчатковым выніку, па словах вучонага, вызначае спецыфіку аб’екта.

Структурны метад спрыяў распаўсюджванню ў сучасным літаратуразнаўстве метаду матыўнага аналізу. За адзінку вывучэння матыўны аналіз бярэ крос-узроўневыя адзінкі, што паўтараюцца, вар’іруюцца і пераплятаюцца з такімі ж іншымі і тым самым надаюць твору непаўторнасць. У адрозненне ад прыхільнікаў структурнага метаду, якія зыходзяць з наяўнасці ў тэксце жорсткай іерархіі ўзроўняў структуры тэксту, прыхільнікі сучаснага матыўнага аналізу сцвярджаюць адсутнасць узроўняў і прытрымліваюцца погляду, што структура тэксту – гэта не крышталічная рашотка, а заблытаны клубок нітак. Прыёмы матыўнага аналізу знайшлі ўвасабленне ў даследаваннях расійска-канадскага даследчыка Б. Гаспарава, беларускіх – І. Жука, Д. Лебядзевіча, А. Петрушкевіч.

*Генератыўная паэтыка*, або паэтыка, якая нараджае, – напрамак літаратуразнаўчых даследаванняў, які выкарыстоўвае метады генератыўнай лінгвістыкі для мадэлявання літаратурных з’яў і

Репозиторий ВГУ

працэсаў ад прыватных момантаў (структура тропаў, сюжэт, метр) да іх агульнай структуры і эвалюцыі паэтычных сістэм. У аснове генератыўнай паэтыкі ляжыць уяўленне, што ўся складанасць і разнастайнасць літаратурных феноменаў можа быць выведзена з абмежаванага набору параўнальна простых канструктаў з дапамогай стандартных працэдур. Генератыўная паэтыка адрознівае глыбінныя і павярхоўныя структуры. Глыбінныя структуры нараджаюцца строга па пэўных правілах і ў ідэальным выглядзе адлюстроўваюць найбольш істотныя ўласцівасці мадэлюемага аб'екта. Павярхоўныя структуры выводзяцца з глыбінных шляхам прымянення да іх правіл трансфармацыі, а таму яны адлюстроўваюць уласцівасці мадэлюемага аб'екта з ізамарфічнай дакладнасцю.

Генератыўная паэтыка даследуе ўласна паэтычныя прынцыпы структуры тэксту: "тэма–прыёмы выразнасці–тэкст", дзе "тэма" і "тэкст" у роўнай ступені належаць да павярхоўных структур.

### *Сацыялагічны метад*

*Змест тэмы*: 1.Традыцыі сацыялагізму ад Платона да Маркса, рух ад мімесісу (тэорыі пераймання) да тэорыі адлюстравання. 2. Атрыбутыўныя рысы сацыялагічнага напрамку. 3. Вульгарны сацыялагізм. 4. Выкарыстанне ідэй неа- і постмарксізму ў работах А. Грамшы, Д. Лукача, Т. Адорна, Г. Маркузэ, Ю. Хабермаса і інш. 5. Сацыякультурная крытыка Ф.Р. Лівіса.

Сацыялагічны метад грунтуецца на разуменні літаратуры як формы грамадскай свядомасці. Сфера яго цікавасці сацыяльна-тыповае, а не індывідульнае. Сацыялагісты вылучаюць у творах гістарычныя тэндэнцыі, сацыяльна абумоўленыя моманты, адлюстраванне дзеяння эканамічных і палітычных законаў, вобразы-характары, цесна звязаныя з грамадскай атмасферай.

Праблема ўзаемадзеяння мастацтва і літаратуры з грамадствам была пастаўлена яшчэ на ранніх этапах развіцця мастацтва, у прыватнасці ў "Паэтыцы" Арыстоцеля. Тэорыя мімесісу (пераймання), прапанаваная ў антычнасці, потым эвалюцыянавала ў бок тэорыі адлюстравання, абгрунтаванай у работах К. Маркса, Ф. Энгельса, У. Леніна. Пытанне пра сацыяльную прыроду літаратуры і метады сістэмнага вывучэння гэтай прыроды трапілі ў лік прыярытэтных у сярэдзіне XIX стагоддзя дзякуючы прадстаўнікам культурна-гістарычнага метаду. З культурна-гістарычнай школай сацыялагічны метад збліжаюць разгляд літаратуры як выяўлення матэрыяльных заканамернасцей духоўнай культуры народа, увага да сацыяльна-тыповага, да працэсаў, а не да індывідуальнасцей, тлумачэнне законаў мастацкай творчасці пры дапамозе законаў іншых навук і ў першую



Рэпазіторый ВДУ

чаргу эканомікі і сацыялогіі, цікавасць да ўздзеяння літаратуры на грамадскае жыццё.

Сацыялагічны метад у СССР быў фактычна асноўным метадам разгляду літаратурных твораў. Беларуская навука пра літаратуру ў асобах З. Жылуновіча, М. Байкова, М. Піятуховіча і інш. пры характарыстыцы літаратурных твораў часта перабольшвала ролю сацыяльна-эканамічных фактараў у працэсе стварэння літаратурных твораў. З другой паловы 1920-х гадоў у савецкім літаратуразнаўстве першаступеннае значэнне набыло палажэнне пра класавае і партыйнае разуменне літаратуры. Сацыялагічны метад эвалюцыянаваў у бок спрошчанага, ***вульгарнага сацыялагізму***, які прамалінейна звязваў мастацкае мысленне пісьменніка з яго класавымі каранямі, адносінамі да палітычнай барацьбы. Вульгарны сацыялагізм гранічна перабольшваў ролю эканамічных фактараў у развіцці літаратуры. Яго прадстаўнікі ( У. Фрычэ, А. Багданаў, Г. Лялевіч, Я. Бранштэйн, Л. Бэндэ, М. Клімковіч і інш.) ігнаравалі эстэтычную прыроду літаратуры, а аналіз літаратурнага твора зводзілі фактычна да характарыстыкі сацыяльнага паходжання аўтара і ацэнкі сацыяльных поглядаў пісьменніка на падставе выбару ім тэматыкі, праблематыкі, персанажаў. У межах сацыялагічнага метаду мелі папулярнасць ідэі псіхаідэалогіі. У працах В. Пераверзева, М. Байкова і некаторых іншых пры аналізе твораў сцвярджалася, што сацыяльнае паходжанне аўтара, незалежна ад пісьменніцкай волі, адбіваецца ў мастацкай творчасці.

Ідэі сацыялагічнага метаду ў форме неамарксізму і постмарксізму атрымалі працяг і развіццё ў працах А. Грамшы, Д. Лукача, Т. Адорна, Г. Маркузэ, Ю. Хабермаса і інш. Пасля Другой сусветнай вайны Т. Адорна, Г. Маркузэ, М. Хоркхаймер востра крытыкавалі заходняе грамадства спажывання. Аналіз “культурнай індустрыі”, пачаты тэарэтыкамі Франкфурцкай школы ў міжваенны перыяд (Т. Адорна, М. Хоркхаймер), у 1960-я працягнулі Г. Маркузэ, М. Маклюэн, С. Сонтаг, паводле якіх сучасную цывілізацыю найперш прадстаўляюць не віды мастацтва, а мас-медыя. Ю. Хабермас распрацаваў у 1970–1990 гады мадэль камунікатыўнай рацыянальнасці.

Адгалінаваннем сацыялагічнага метаду з’яўлялася *сацыякультурная крытыка*, тэарэтычныя палажэнні якой былі распрацаваны Ф.Р. Лівісам. Яна акцэнтавала абумоўленасць асаблівасцей эпохі сацыякультурным фонам, філасофскай і сацыяльнай парадыгмай, пры аналізе мастацкіх твораў звяртала ўвагу на эканамічныя фактары, узровень развіцця цывілізацыі. У другой палове ХХ стагоддзя сацыялагічны метад звяртаўся да паасобных прыёмаў структуралізму. Сведчанне таму – працы Л. Гальдмана



Рэпазіторый ВГУ

“Схаваны бог”, “Аб сацыялогіі рамана”, “Марксізм і гуманітарныя навукі”, “Разумовыя структуры і мастацкая творчасць”.

### *Постструктуралізм*

*Змест тэмы*: 1. Філасофскія асновы і вызначальныя рысы постструктуралізму. 2. Дэканструктывізм як літаратуразнаўчая версія постструктуралізму. 3. Постмадэрнізм. 4. Нараталогія. 5. Інтэртэкстуальнасць.

Постструктуралізм стаў працягам, ідэйным і метадалагічным апанентам структуралізму. Яму ўласцівы негатыўнае стаўленне да спроб рацыянальнага абгрунтавання феноменаў рэчаіснасці і культуры, міждысцыплінарнасць праблематыкі даследаванняў, ідэалагічная і філасофская плюралістычнасць. Канцэпцыю “ўніверсалізму”, тлумачальную схему, што прэтэндуе на лагічнае абгрунтаванне заканамернасцей рэчаіснасці, постструктуралісты разглядаюць як “маску дагматызму”, а такога роду дзейнасць расцэньваюць як праяву “метафізікі”. Да яе яны адносяць прынцыпы прычыннасці, ідэнтычнасці, ісціны і г.д. Постструктуралісты адмоўна ставяцца да ідэй росту, прагрэсу ў галіне навуковых ведаў, у сацыяльна-культурным развіцці. Яны ўзвышаюць нестабільнае, супярэчлівае, фрагментарнае, сцвярджаюць прынцып метадалагічнага сумніву ў адносінах да “пазітыўных ісцін”, перакананняў, што прымяняюцца для “легітымізацыі”, па іх тэрміналогіі, грамадства. Тэарэтык постструктуралізму М. Фуко зазначаў, што веды заўсёды з’яўляюцца прадуктам уладных адносін, а паслядоўнікі Фуко бачаць у грамадстве найперш барацьбу за “ўладу інтэрпрэтацый” розных ідэалагічных сістэм. “Пануючыя ідэалогіі”, паводле постструктуралістаў, аваладваюць “індустрыяй культуры”, насаджаюць індывідам сваю мову, свой лад мыслення. Мова разглядаецца постструктуралістамі як інструмент сацыяльнай камунікацыі, маніпуляванне якім з боку “пануючай ідэалогіі” датычыцца не толькі мовы навукі, яно выяўляецца і ў “дэградацыі” мовы паўсядзённасці, служыць сімптомам адносін “панавання і падаўлення”.

Тэорыя постструктуралізму ў літаратуразнаўчым плане развівалася як крытыка структуралізму, што вялася па праблемах структурнасці, знакавасці, камунікатыўнасці, цэласнасці суб’екта. Постструктуралізм – агульнаметадалагічная аснова, на фундаменце якой дэканструктывісты і постмадэрністы будавалі свае канцэпцыі, што адрозніваліся паміж сабой зменай даследчыцкіх прыярытэтаў, ідэйна-эстэтычнымі арыентацыямі, характарам аналізу, накіраваным найперш на вывучэнне літаратуры.



Репозиторий ВГУ

*Дэканструктывізм* – літаратуразнаўчая распрацоўка агульнай тэорыі постструктуралізму. Прынцыпы дэканструктывізму ўпершыню сфармулявалі французскія постструктуралісты Ж. Дэрыда, М. Фуко, Ю. Крысцева. У 1979 годзе ў ЗША выйшаў зборнік Ж. Дэрыды, П. дэ Мана, Х. Блума, Дж. Хартмана, Дж.Х. Мілера "Дэканструкцыя і крытыка", які атрымаў назву "Ельскага маніфеста", або "Маніфеста Ельскай школы". Апрача "Ельскай школы", уплывовага і аўтарытэтнага напрамку ў амерыканскім дэканструктывізме, вылучаюцца таксама "герменеўтычны напрамак" (У. Спейнас), "левы дэканструктывізм" (Дж. Брэнкман, М. Р'ян, Ф. Лентрыкія), блізкі да англійскага сацыялагічна арыентаванага неамарксізму (Т. Іглтан, С. Хіт, Э. Істхоўп), "феміністская крытыка" (Г. Співак, Б. Джонсан, Ю. Крысцева, Л. Ірыгай і інш.).

Назва "дэканструктывізм" пайшла ад асноўнага прынцыпу аналізу тэксту, прапанаванага Ж. Дэрыдой, – "дэканструкцыі", сэнс якой заключаецца ў выяўленні ўнутранай супярэчлівасці тэксту, у знаходжанні ў тэксце схаваных і не заўважаных не толькі "наіўным" чытачом, але і аўтарам "рэшткавых сэнсаў", што дасталіся ў спадчыну ад дыскурсіўных практык мінулага, замацаваных у мове ў форме стэрэатыпаў думкі і бессвядома трансфармуемых сучаснымі аўтару моўных клішэ. Ельскія дэканструктывісты развівалі ідэі Дэрыды пра непазбежнасць памылковасці прачытання любога тэксту. Прыкметнае адгалінаванне дэканструктывізму – феміністская крытыка, якая абапіраецца на ідэі Ж. Дэрыды і Ж. Лакана, у прыватнасці, на лаканаўскае сцвярджэнне, што бессвядомае структуравана так, як і мова. Канцэпцыя "лагацэнтрызму" ацэньваецца тут як адлюстраванне выключна мужчынскага, патрыярхальнага пачатку. Феміністы акцэнтуюць тэзіс пра інтуітыўную, жаночую прыроду "пісьма", крытыкуюць стэрэатыпы "мужчынскага менталітэту", артыкулююць асаблівую, прывілеяваную ролю жанчыны ў афармленні структуры свядомасці чалавека.

Спецыфічнасць амерыканскага жаночага прачытання тэкстаў (Э. Шоўолтэр, Дж. Мітчэл, Б. Крысціян, С. Гілберт, С. Грубар і інш.) грунтуецца на прыярытэтнасці псіхалагічна-біялагічнага і сацыяльнага жаночага вопыту і жаночага ўспрымання літаратуры, на акцэнтаванні своеасаблівасці жаночага перажывання эстэтычнага вопыту. Гэты вопыт падштурхоўвае да ўсведамлення сацыяльных кодаў тэксту, што ўспрымаюцца як прыкметы духоўна-біялагічнага адрознення жаночай і мужчынскай псіхікі.

*Постмадэрнізм* у літаратуразнаўстве прадстаўлены работамі Ж.-Ф. Ліятара, І. Хасана, Д.В. Факема, Дж. Батлера і інш. Ён абапіраецца на тэорыю і практыку постструктуралізму і дэканструктывізму, спрабуе выявіць на ўзроўні арганізацыі

Рэпазіторый ВДУ

мастацкага тэксту пэўны светапоглядны комплекс спецыфічным чынам эмацыянальна афарбаваных уяўленняў. Прыхільнікі постмадэрнізму карыстаюцца такімі паняццямі, як “свет як хаос”, “постмадэрнісцкая адчувальнасць”, “свет як тэкст”, “свядомасць як тэкст”, “інтэртэкстуальнасць”, “крызіс аўтарытэтаў”, “эпістэмалагічная няўпэўненасць”, “аўтарская маска”, “двайны код”, “парадыйны модус” аповеду, “пасціш”, “метаапавяданне”, “супярэчлівасць”, “дыскрэтнасць, фрагментарнасць аповеду”, “правал камунікацыі” і іншымі.

Постмадэрнісцкі погляд на свет угрунтаваны на перакананні, што любая спроба сканструяваць мадэль свету бессэнсоўная, што дапускаецца існаванне мадэлі рэчаіснасці, заснаванай на максімальнай энтрапіі, на роўнаверагоднасці і роўнакаштоўнасці ўсіх яе канстутыітыўных элементаў. Постмадэрністы абапіраліся на прапанаваную Ж. Дэлёзам тэорыю “намадалагічнага мыслення”, сутнасць якой у адпачатковай адноснасці любога меркавання. Постмадэрнізм шырока аперыруе такімі паняццямі, як “сімулякр” і “рызома”. “Сімулякр” – гэта вобраз з неіснуючай рэчаіснасці, праўдападобная падробка пад вобраз з жыцця, гіперрэальны аб’ект-пустышка (Ж. Батай). Паводле постмадэрністаў, літаратура аперыруе сімулякрамі. Паняцце “рызома” ў дастасаванні да гуманітарных навук распрацавалі Ж. Дэлёз і Ф. Гватары. Рызома, паводле іх трактоўкі, – метафарычнае абазначэнне пазаструктурнага і пазасістэмнага фіксатара нейкай цэласнасці.

Постмадэрністы прапанавалі даследаваць разнастайныя спосабы апавядальніцкай тэхнікі, накіраванай на стварэнне фрагментарнага дыскурсу, або фрагментарнасці апавядання.

*Нараталогія* – тэорыя апавядання, яна займае прамежкавае становішча паміж структуралізмам, рэцэптыўнай эстэтыкай і крытыкай чытацкіх рэакцый. Яна не адмаўляецца ад паняцця глыбіннай структуры, якая ляжыць у аснове любога мастацкага твора, але яе цікавіць працэс рэалізацыі гэтай структуры падчас актыўнага дыялагічнага ўзаемадзеяння пісьменніка і чытача. “Дыскурс” – адно з цэнтральных паняццяў нараталогіі. М. Фуко вызначаў “дыскурс” як групу выказванняў, звязаную пэўнай генератыўнай сістэмай, у якасці прыкладу прыводзіў клінічны дыскурс, дыскурсы эканамічны, псіхіятрычны, дыскурс натуральнай гісторыі. У адрозненне ад індывідуальнага маўленчага акта, дыскурс – агульныя, тыпізаваныя рысы маўлення; тэкставая арганізацыя маўлення на павярхоўным узроўні, маўленчыя структуры, характэрныя для ўсіх тыпаў тэкстаў, самі гэтыя тэксты як матэрыяльная каштоўнасць; тэкставая арганізацыя на глыбінным узроўні, глыбінны сінтаксіс тэксту. Нараталогія – у многім трансфармаваная форма структуралізму. Яе



Рэпазіторый ВДУ

асноўныя палажэнні: літаратура мае камунікатыўную прыроду; акт камунікацыі – працэс, які адбываецца адначасова на некалькіх апавядальніцкіх узроўнях. А таму неабходна даследаваць праблемы дыскурсу і тэарэтычна абгрунтаваць шматлікія апавядальніцкія інстанцыі, што выступаюць у ролі частак камунікатыўнага ланцуга, па якім ажыццяўляецца перадача мастацкай інфармацыі ад пісьменніка да чытача. Камунікатыўная прырода літаратуры патрабуе наяўнасці камунікатыўнага ланцуга, які ўключае адпраўшчыка інфармацыі (камуніката, аўтара твора) і атрымальніка паведамлення (чытача); знакавы характар камуніката, які патрабуе папярэдняга кадзіравання знакаў тэксту адпраўшчыком; сістэму абумоўленасці прымянення знакаў, заканамерна дэтэрмінаванай суаднесенасці з пазалітаратурнай рэальнасцю, з мастацкай традыцыяй як сістэмай прынятых літаратурных канвенцый. Пад літаратурнай традыцыяй у нараталогіі маецца на ўвазе прыналежнасць тэксту да сістэмы літаратурных жанраў, тэматычная і вобразная сувязь тэксту з літаратурным напрамкам, фальклорам, нацыянальнай і сусветнай літаратурнай традыцыяй, з традыцыямі іншых відаў мастацтва і духоўнай дзейнасці (філасофіі, рэлігі, эстэтыкі і г.д.). Пошукі наратолагамі фармальных прыкмет пісьменніка і чытача ў мастацкім творы – спроба аб’ектываваць камунікатыўны працэс ва ўсіх яго падрабязнасцях з пункту гледжання апавядальніцкага тэксту.

У нараталогіі вылучаюць два асноўныя напрамкі: вывучэнне апавядальніцкіх інстанцый (М. Баль, З. Шмідт, Я. Лінтвельт і інш.) і даследаванне дыскурсіўных узроўняў (М. Рыфатэр, Ж. Куртэ, П. ван дэн Хевель і інш.). Метадалогія нараталогіі пры яе пэўнай аднабаковасці спрыяе больш глыбокаму разуменню камунікатыўнай прыроды слоўнага мастацтва.

М.М. Бахцін у рабоце “Праблема зместу, матэрыялу і формы ў слоўнай мастацкай творчасці” даказаў, што, акрамя дадзенай пісьменніку рэчаіснасці, пісьменнік мае справу адначасова з літаратурай, якая папярэднічала яму, і з сучаснай літаратурай, напрацоўкі якой улічвае. У 1967 годзе ў працы “Слова, дыялог, раман” Ю. Крысцева выкарыстала тэрмін “*інтэртэкстуальнасць*” у значэнні, якое змяняла паняцце дыялагізму, распрацаванае М. Бахціным. Тэкст трактаваўся Ю. Крысцевай як вынік шырокага ўзаемадзеяння тэкстаў, дзе сэнс тэксту мяняецца ў залежнасці ад таго, якія тэксты выбірае інтэрпрэтатар. Крысцева ўвяла новае ўяўленне пра літаратуру, дзе слова функцыянуе ў трох вымярэннях “*сюжэт – адрасат – кантэкст*” як спалучэнне амбівалентных элементаў. Канцэпцыя Ю. Крысцевай атрымала развіццё і працяг у работах Р. Барта і многіх іншых навукоўцаў і літаратуразнаўцаў. У артыкуле “Тэорыя тэксту” (1973) Р. Барт пісаў, што кожны тэкст ёсць інтэртэкст; іншыя тэксты

Рэпазіторый ВДУ

прысутнічаюць у ім на розных узроўнях у больш ці менш пазнавальных формах. Пад уплывам ідэй Ю. Крысцевай з’явіліся ідэі “тэарэтычнай смерці суб’екта” М. Фуко, “смерці аўтара” Р. Барта, “смерці індывідуальнага тэксту”, які нібыта раствараецца ў відавочных ці латэнтных цытатах, “смерці чытача”.

Постмадэрністы разглядалі інтэртэкстуальнасць як адзіны механізм стварэння тэксту і звязвалі яе са сцвярджэннем Ж. Дэрыды, што “свет ёсць тэкст”. Згодна з ім, уся культура чалавецтва разглядаецца як адзінае цэлае, адзіны тэкст, уключаны ў быццё, гэта значыць як нейкі адзіны інтэртэкст. Усе ствараемыя тэксты ў такім выпадку, з аднаго боку, у сваёй аснове маюць адзіны прэтэкст (культурны кантэкст, літаратурная традыцыя), а з другога боку – з’яўляюцца інтэртэкстамі, бо становяцца з’явамі культуры. Канкрэтны змест тэрміна “інтэртэкстуальнасць” змяняўся ў залежнасці ад тэарэтычных і філасофскіх ідэй, якімі карыстаўся ў сваёй дзейнасці канкрэтны вучоны. Агульным жа для ўсіх навукоўцаў з’яўляецца палажэнне, што кожны тэкст – рэакцыя на папярэдне напісаныя тэксты. Інтэртэкстуальнасць прымушае разглядаць літаратуру як свайго кшталту бібліятэку, дзе кожны тэкст відазмяняе іншыя і сам змяняецца пад іх уздзеяннем.

Увага вучоных да праблем інтэртэкстуальнасці абумоўлена пошукамі новых шляхоў вырашэння праблемы традыцый і наватарства, бо выяўленне інтэртэкстуальных сувязей канкрэтнага літаратурнага твора дазваляе паказаць уплыў іншых тэкстаў на фарміраванне індывідуальнага стылю пэўнага аўтара або верагоднасць гэтага ўплыву, уключанасць творчасці канкрэтнага аўтара ў шырокі літаратурны кантэкст. Яна абумоўлена і значнасцю вывучэння сэнсавага боку літаратурных твораў з улікам сувязей на ўзроўні літаратурнага напрамку, нацыянальнай і сусветнай літаратуры, культуры ўвогуле, а таксама наяўнасцю прамых ці ўскосных адсылак да іншых тэкстаў.

Французскі даследчык Ж. Жэнет у кнізе “Палімпсесты”: літаратура ў другой ступені” прапанаваў наступную класіфікацыю тыпаў узаемадзеяння тэкстаў: інтэртэкстуальнасць як адначасовая прысутнасць у тэксце двух і больш тэкстаў (цытата, алюзія, плагіят і інш.); паратэкстуальнасць як адносіны тэксту да сваёй назвы, пасляслоўя, эпіграфа; метатэкстуальнасць як спасылка ў выглядзе каментарыя ці крытычная спасылка на свой уласны прэтэкст; гіпертэкстуальнасць як высмейванне і парадзіраванне адным тэкстам другога; архітэкстуальнасць як жанравая сувязь тэкстаў. З улікам класіфікацыі Ж. Жэнета Н. Фацеева падзяліла інтэртэкстуальныя элементы на ўласна інтэртэкстуальныя, якія ўтвараюць канструкцыю “тэкст у тэксце” і ўключаюць цытаты і алюзіі; паратэкстуальныя, якія

Рэпазіторый ВДУ

характарызуюцца суаднясеннем “загаловак-тэкст”, “эпіграф-тэкст”; метатэкстуальныя, якія вызначаюцца стварэннем канструкцыі “тэкст аб тэксце”; гіпертэкстуальныя, якія характарызуюцца стварэннем пародый на прэтэксты; архітэкстуальныя, якія грунтуюцца на жанравай сувязі тэкстаў; інтэртэкстуальныя з’явы: інтэртэкст як троп, інтэрмедыяльныя тропы, запазычанне прыёму, уплывы ў галіне стылю.

### *Новыя напрамкі сучаснага літаратуразнаўства*

*Змест заняткаў*: 1. Кагнітыўнае літаратуразнаўства. 2. Новы гістарызм. 3. Біяпаэтыка.

*Кагнітыўнае літаратуразнаўства* – напрамак, які пры вывучэнні літаратурных твораў выкарыстоўвае тэрміналагічны апарат, распрацаваны ў межах кагнітыўнай навукі – міждысцыплінарнай галіны ведаў, што даследуе механізмы рэпрэзентацыі ведаў і іх апрацоўкі чалавекам. Асновай для кагнітыўнага вывучэння літаратуры служыць уяўленне пра слоўнае мастацтва як пра ментальную дзейнасць. Мэта кагнітывізму – устанаўленне сувязей паміж структурамі думкі і структурамі выяўлення. Характэрныя рысы кагнітыўнага літаратуразнаўства наступныя: сцвярджэнне эмпірызму існуючай навуковай метадалогіі; пошук змястоўных аналогій паміж з’явамі літаратуры і вывадамі нейрабіялогіі, фізіялогіі, псіхалогіі; матэрыялістычнае разуменне культуры; інтэрпрэтацыйны падыход; перакананне, што біялагічны цялесны вопыт надае мысленню пэўную форму і накладвае на мысленне пэўныя абмежаванні. Традыцыйныя літаратуразнаўчыя тэрміны (метафара, наратыў, гісторыя як пэўны сюжэт і інш.) выкарыстоўваюцца кагнітывістамі для апісання ўніверсальных механізмаў мыслення; у многіх работах аб’ядноўваецца даследаванне чалавечага мыслення праз аналогію з літаратурай, а літаратура вывучаецца як разнавіднасць чалавечага мыслення. Так, Э. Спольскі ў кнізе “Разрывы сэрца” (1993) на аснове работ нейрафізіёлагаў даследавала прыроджаную кагнітыўную нестабільнасць чалавечай свядомасці як наступства няпоўнай сумяшчальнасці разнастайных функцыянальных падсістэм мозга (модулей). Рэкамбінаторныя магчымасці чалавечага мозга і разрывы паміж падсістэмамі мозга, па Спольскі, забяспечваюць магчымасць множнасці варыянтаў успрымання іінавацый у галіне літаратурнай творчасці і літаратурнай крытыкі. М.Т. Крэйн у працы “Мозг Шэкспіра” (2001) ужыла ў дастасаванні да літаратуры сцвярджэнне пра дамінантную ролю цялеснага вопыту ў фарміраванні мысліцельных схем.

Тэрмін “*новы гістарызм*” быў прапанаваны амерыканскім літаратуразнаўцам, выкладчыкам Каліфарнійскага ўніверсітэта

Рэпазіторый ВГУ

С. Грынблатам у прадмове да часопіса “Genre” за 1982 год, прысвечанаму англійскаму Рэнесансу. У кнізе “Фарміраванне “я” ў эпоху Рэнесансу. Ад Мора да Шэкспіра” (1980) Грынблат абазначыў гэты падыход як “паэтыку культуры”. Новы гістарызм бачыць генезіс літаратурнага твора ў сацыяльных інстытутах, культурных практыках, духоўных канцэпцыях таго соцыуму, у межах якога ўзнік літаратурны твор, а таксама вывучае зваротны ўплыў літаратурных тэкстаў на гэтыя інстытуты, практыкі і канцэпты. “Новыя гісторыкі” падкрэсліваюць умоўнасць меж паміж культурнымі практыкамі (у прыватнасці, паміж мастацтвам і рэлігіяй), трактуюць паняцце “літаратура” як выключна канвенцыйнае, матываванае канкрэтнымі ўяўленнямі пэўнай эпохі, адсюль іх схільнасць да інтэрдысцыплінарных даследаванняў. Гістарычны працэс усведамляецца новымі гісторыкамі як тэкст, а гістарычнае даследаванне – як форма тэкстуальнага аналізу, гісторыя тлумачыцца як адзін з магчымых дыскурсаў, як патэнцыя, што заключае ў сабе ажыццёўленыя і неажыццёўленыя магчымасці. У такой трактоўцы гісторыя набывае характар рукапісу, тэксту, які можна дапісваць, відазмяняць па сваім жаданні.

У канцы ХХ стагоддзя ў амерыканскім літаратуразнаўстве нарадзілася школа *біяпаэтыкі*. Яе тэарэтык – Дж. Кэрал (Кентукі, Тэхас). Біяпаэтыка імкнецца да рацыяналістычнага вытлумачэння прызнаных твораў мастацтва з пункту гледжання эвалюцыяніцкай псіхалогіі, да асэнсавання на матэрыяле літаратурных твораў уплыву генаў на паводзіны асобы. Кэрал і яго прыхільнікі галоўным чынам звяртаюцца да твораў, у цэнтры якіх гісторыя пэўнага роду, пэўнай сям’і. Біяпаэтыка істотна рэдукуе змест твора, разглядае твор па-за межамі эстэтычнай прыроды.

## *Сучаснае беларускае літаратуразнаўства: праблематыка і метадалогія*

*Змест тэмы*: 1. Кароткая гісторыя метадалогіі беларускага літаратуразнаўства. 2. Праблематыка. 3. Метадалогія сучаснага беларускага літаратуразнаўства.

Пачатак ХХ стагоддзя правамерна называюць часам інтэнсіўнага станаўлення беларускага літаратуразнаўства. Значны ўплыў на фарміраванне метадалогіі айчыннай навукі пра літаратуру аказала культурна-гістарычная школа. У працах М. Багдановіча, М. Гарэцкага, В. Ластоўскага, А. Навіны вялікая ўвага надавалася даследаванню ўзаемадачыненняў паміж прыгожым пісьменствам і нацыянальнай рэчаіснасцю. Пачынальнікі беларускай навукі пра літаратуру, у адрозненне ад традыцыйных прадстаўнікоў культурна-гістарычнай

Рэпазіторый ВДУ

школы, звярталі ўвагу не толькі на пазнавальны патэнцыял, але і на мастацкія вартасці твораў айчыннага прыгожага пісьменства.

Ідэі кампаратывізму імпанавалі М. Багдановічу, пра што сведчаць яго работы “ Забыты шлях”, “Памяці Т.Р. Шаўчэнкі”, “Іван Франко”, “Дзве заўвагі аб вершах Пушкіна”, “Булгарын у беларускай жартоўнай паэме” і іншыя. 1920-я гады – час, калі ўмацоўваў свае пазіцыі сацыялагічны метад, нягледзячы на гэта ў асяроддзі літаратуразнаўцаў мелі пэўнае распаўсюджанне ідэі фармалістаў. Метадалогію культурна-гістарычнай школы ў спалучэнні з прыёмамі сацыялагічнага метаду актыўна выкарыстоўваў І. Замоцін у навуковых працах пра “Новую зямлю” і “Сымона-музыку” Я. Коласа, пра беларускую драматургію новага часу і творчасць М. Багдановіча, дзе вучонага найперш цікавілі суадносіны літаратуры і жыцця. Належнае метадалогіі сацыялагізму аддаў і Я. Барычэўскі, але, як паказвае праблематыка яго работ (жанралогія, эстэтычная прырода літаратуры), яму была бліжэй метадалогія фармалістычнай накіраванасці. Таленавітым прадстаўніком фармальнага метаду з’яўляўся А. Вазнясенскі. Ён акцэнтаваў ролю кампазіцыі, вывучаў структуру твораў, атаясамліваў рэалізм з натуралістычным апісаннем, гісторыка-літаратурныя метады падзяляў на канстатавальныя (апісальныя) і экзегетыўныя (тлумачальныя).

З сярэдзіны 1920-х гадоў у беларускім літаратуразнаўстве вульгарнасацыялагічная метадалогія стала выцясняць іншыя. У даследаваннях М. Піятуховіча, Л. Бэндэ, А. Кучара і інш. надзвычай прамалінейна разглядаліся суадносіны рэчаіснасці і літаратуры, а творчасць пісьменнікаў найперш ацэньвалася ў залежнасці ад класавай прыналежнасці і сацыяльнага атачэння. З другой паловы 1950-х гадоў беларускае літаратуразнаўства стала больш актыўна засвойваць ідэі і прыёмы класічнага і сучаснага яму сусветнага літаратуразнаўства, значна часцей звяртацца да вопыту фармальнага метаду і біяграфічнага метадаў, фенаменалагізму, структуралізму, постструктуралізму і г.д.

Спектр пытанняў, вырашэннем якіх займаецца сучаснае айчыннае літаратуратуразнаўства, дастаткова шырокі. Значнае роля беларускімі навукоўцамі адводзіцца асэнсаванню сувязей слоўнага мастацтва з рэчаіснасцю, узаемадзеянню літаратуры з іншымі відамі мастацтва, узаемаадносінам айчыннай літаратуры з літаратурамі свету. Традыцыйна беларускае літаратуразнаўства шмат увагі надае асэнсаванню сувязі слоўнага мастацтва з рэчаіснасцю. Сведчанне таму – навуковыя працы В. Каваленкі, І. Навуменкі, А. Яскевіча і інш. Важная заканамернасць літаратурнага працэсу – літаратурныя сувязі, прадстаўленыя ў грунтоўных даследаваннях А. Адамовіча, В. Каваленкі, В. Гапавай, А. Мальдзіса, М. Тычыны і інш.

Рэпазіторый ВДУ

Асэнсаванне агульнатыпалагічных і нацыянальна-спецыфічных заканамернасцей літаратурнага працэсу – таксама прыярытэтная задача айчыннага літаратуразнаўства. Так, шмат увагі даследаванню традыцый і наватарства адводзіцца ў працах У. Гніламёдава, А. Яскевіча. Беларускае літаратуразнаўства доўгі час спасцігала літаратурныя феномены праз прызму рэалізму, ігнаравала факт узаемасувязей і ўзаемадзеяння розных мастацкіх сістэм, напрамкаў, стыляў, якія мелі спецыфічныя праявы ў нацыянальным прыгожым пісьменстве. У працах І. Багдановіч, П. Васючэнкі, Е. Лявонавай, В. Максімовіча дадзена новая ацэнка складанаму літаратурнаму працэсу, узаемадачыненням у ім розных мастацкіх метадаў і напрамкаў.

Вялікая ўвага ў айчынных літаратуразнаўчых даследаваннях звяртаецца на вобразную і структурную арганізацыю літаратурнага твора, на пытанні стылю. Важкі ўклад у іх распрацоўку зрабілі А. Адамовіч, А. Яскевіч, П. Дзюбайла. Традыцыйны і прадуктыўны напрамак даследаванняў – жанралогія. Жанрава-стылёвую разнастайнасць сучаснай беларускай лірыкі глыбока ахарактарызаваў М. Мішчанчук у працы "Ёсць у паэта свой аблог цалінны…", дзе паказана месца ў сучасным літаратурным працэсе оды, балады, элегіі. Прадмет зацікаўленасці айчынных літаратуразнаўцаў склалі і некласічныя формы лірычнага выяўлення, такія, як верлібр (А. Кабаковіч "Беларускі свабодны верш", 1984; Г. Кісліцына "Алесь Разанаў: праблема мастацкай свядомасці", 1997). Развіццё жанру балады ў беларускай літаратуры грунтоўна распрацавана І. Штэйнерам, суадносіны паміж структурай твораў і жанрам – В. Жураўлёвым. Абагульненню працэсаў жанравага развіцця беларускай прозы прысвечаны працы Л. Сіньковай "Беларуская проза XX стагоддзя : дынаміка жанравых структур" (1996), А. Макарэвіча "Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе XIX – пачатку XX ст." (1999). Драматычныя творы канцэптуальна-сістэмна вывучаюцца ў працах С. Лаўшука і С. Ганчаровай-Грабоўскай. Асаблівае месца ў сістэме жанраў сучаснай беларускай прозы належыць раману. У 1961 годзе выйшла змястоўная праца А. Адамовіча "Беларускі раман: станаўленне жанра", дзе разглядалася праблема генезісу раманных форм у беларускай прозе, аналізаваліся найбольш значныя творы гэтага жанру. Даследаванне развіцця беларускага рамана было працягнута П. Дзюбайлам. Так, у манаграфіі "Беларускія раман: гады 70-я" (1982) асэнсоўваліся тэндэнцыі гістарычнай дынамікі рамана. Укладу Я. Коласа ў развіццё тэорыі і практыкі беларускай раманістыкі прысвечана кніга В. Жураўлёва "Якуб Колас і паэтыка беларускага рамана". Імклівае развіццё рамана, аповесці і іншых празаічных жанраў абумовіла вывучэнне праблем псіхалагізму, прыёмаў і сродкаў выяўлення складанасці характару і

Рэпазіторый ВГУ

душэўнага складу персанажаў у працах А. Матрунёнка “Псіхалагічны аналіз і станаўленне беларускага рамана” (1975); “Псіхалагічны аналіз у сучасным беларускім рамане” (1972). Рытмічная структура верша сістэмна асэнсоўвалася А. Яскевічам, а прозы – І. Жуком, аўтарам манаграфіі “Празаічны тэкст: дынаміка рытмавага існавання” (2003), дзе даследчык пераканаўча даказаў, што вывучэнне мастацкай катэгорыі рытму істотна дапамагае ва ўстанаўленні аўтарства ананімных твораў.

Праблемы паэтыкі, адметнасць мастацкага свету твораў знаходзяцца ў цэнтры ўвагі манаграфій Я. Гарадніцкага. Адным з напрамкаў сучаснага літаратуразнаўчага даследавання стала вывучэнне прадметнага свету літаратуры. Яскравае сведчанне гэтага – працы А. Бельскага, у прыватнасці, “Жывая мова краявідаў: пейзаж у беларускай паэзіі” (1997), дзе на багатым фактычным матэрыяле выяўлены асаблівасці мастацкага функцыянавання пейзажных малюнкаў, прыведзена класіфікацыя тыпаў пейзажу, устаноўлены функцыі пейзажных малюнкаў, прасочана параўнальна-тыпалагічная суаднесенасць малюнкаў прыроды ў жывапісе, паэзіі, музыцы і іншых відах мастацтва, паказаны суадносіны паміж адлюстраваннем прыроды, грамадскімі рухамі і эстэтычнымі тэорыямі пэўнага гістарычнага часу.

Для айчыннага літаратуразнаўства характэрны падыход да літаратуры як да гістарычна дынамічнай з’явы, таму адна з галоўных праблем асэнсавання нацыянальнай мастацкай спадчыны – літаратура і час. Сёння фарміруецца ўяўленне пра літаратурны твор як пра складаную мастацкую структуру, у якой аўтарам адпачаткова закладзена магчымасць шматстайнага прачытання. Сучаснае беларускае гісторыка-функцыянальнае літаратуразнаўства прадстаўлена грунтоўнымі даследаваннямі М. Мушынскага па гісторыі беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя, па творчасці М. Зарэцкага і М. Гарэцкага, артыкуламі і манаграфіяй З. Мельнікавай “Беларускае гісторыка-функцыянальнае літаратуразнаўства” (2003).

Ва ўмовах XXI стагоддзя становіцца відавочнай неабходнасць у шматпланавых міждысцыплінарных даследаваннях, у асэнсаванні ўсебаковых сувязей літаратурнай тэорыі ў кантэксце шырокага кола агульнафілалагічных і глабальных праблем, яскравае пацвярджэнне таму – праца І. Чароты “Пошук спрадвечнай існасці : беларуская літаратура ў працэсах нацыянальнага самавызначэння (1995). Усведамленне вытокаў нацыянальнай літаратуры, дзе скандэнсаваны нацыянальны менталітэт, псіхалогія, немагчымае без разумення сувязі лёсу народа з сусветнымі тэндэнцыямі развіцця, таму сёння асаблівае значэнне набывае даследаванне архетыпаў – універсальных і

Рэпазіторый ВДУ

нацыянальных, – у якіх максімальна абагульнены эмацыянальны і пазнавальны вопыт, прадстаўлены звычайна міфалагічнымі сімваламі. У працах Т. Шамякінай шматаспектна даследуюцца праявы міфалагічнага мыслення ў літаратуры, структураўтваральная, тропаўтваральная парадыгмы мастацкіх твораў, вызначаецца генезіс міфалагічна-вобразнага мыслення ў сувязі з агульнай эвалюцыяй чалавечай свядомасці; асэнсоўваюцца сувязі паміж літаратурай і міфам; даследуюцца архетыпы, якія знайшлі праявы ў класічнай літаратуры; рэстаўруюцца нацыянальныя міфалагемы ў іх вытоках і сувязях з індаеўрапейскай міфалогіяй; вывучаюцца этнічныя вытокі нацыянальнай самасвядомасці і ўвасабленне праяў нацыянальнага светаадчування ў літаратуры, механізмы пераходу міфалагем у мастацкую тканіну твораў; аналізуюцца хранатоп як структураўтваральны элемент і сімвалы як аснова сакралізацыі дзеля стварэння нацыянальнага міфа. Дастаткова арыгінальны міждысцыплінарны напрамак даследавання літаратуры прапанаваны С. Даніленкам у манаграфіі “Харунжыя Бога : спецыфіка сацыяльнай міфалагізацыі ў савецкай і постсавецкай літаратуры ў кантэксце яе інфернальнай вобразнасці” (2005), дзе слушна адзначаецца, што самыя архаічныя пласты чалавечага мыслення, увасобленыя ў міфах, дазваляюць вылучыць найбольш трывалыя памкненні чалавечай душы ў зменлівым свеце. Шляхам шматузроўневага асэнсавання сацыяльных міфаў С. Даніленка вызначыў асноўныя заканамернасці міфалагізацыі грамадска-палітычных змен у беларускім соцыуме XIX–XX стагоддзяў, раскрыў асаблівасці аксіялагічнай семантыкі сацыяльнага міфа.

Асэнсаванне метадалагічных праблем літаратуразнаўства шырока прадстаўлена ў навуковых працах М. Мушынскага, В. Рагойшы, А. Андрэева, А. Усманавай і інш.

## ПЛАНЫ І ТЭМАТЫКА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

### **Практычныя заняткі № 1.** Псіхалагічны напрамак у літаратуразнаўстве

1. Сацыякультурныя абставіны ўзнікнення біяграфічнага метаду.
2. “Літаратурныя партрэты” Ш.-А. Сент-Бёва: аналіз кнігі.
3. Развіццё ідэй біяграфічнага метаду ў беларускім літаратуразнаўстве. Аналіз манаграфіі В.І. Атрашкевіча “Ад прататыпа да вобраза: праблема аўтабіяграфізму ў беларускай прозе 20-х гадоў” (Мінск, 1984).

Репозиторий ВГУ

*Літаратура*

1. Академические школы в русском литературоведении XIX века. – М. : Наука, 1975. – 515 с.

2. Атрашкевіч, В.І. Ад прататыпа да вобраза : праблема аўтабіяграфізму ў беларускай прозе 20-х гадоў / В.І. Атрашкевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 213с.

3. Афасижев, М.Н. Западные концепции художественного творчества / М.Н. Афасижев. – М. : Высш. школа, 1990. – 176 с.

4. Бароўка, В.Ю. Тэорыя літаратуры / В.Ю. Бароўка. – Віцебск : Выд-ва Віцеб. дзярж. ун-та, 2005. – 48 с.

5. Сент-Бев, Ш. Литературные портреты, критические очерки ; пер. с франц. / Ш. Сент-Бев. – М. : Худож. лит., 1970. – 582 с.

**Практычныя заняткі № 2.** Псіхалагічны напрамак у літаратуразнаўстве

1. Псіхалагічная школа.
2. Псіхааналітызм.
3. Аналіз работ “Аб адносінах аналітычнай псіхалогіі да паэтыка-мастацкай творчасці” К.Г. Юнга і работы “Псіхааналітычныя эцюды” З. Фрэйда.

*Літаратура*

1. Академические школы в русском литературоведении XIX века. – М. : Наука, 1975. – 515 с.

2. Афасижев, М.Н. Западные концепции художественного творчества / М.Н. Афасижев. – М. : Высш. школа, 1990. – 176 с.

3. Бароўка, В.Ю. Тэорыя літаратуры / В.Ю. Бароўка. – Віцебск : Выд-ва Віцеб. дзярж. ун-та, 2005. – 48 с.

4. Нефедов, Н.Т. История зарубежной критики и литературоведения / Н.Т. Нефедов. – М. : Высш. школа, 1988. – 271 с.

5. Фрейд, З. Психоаналитические этюды / З. Фрейд. – Минск : Поппури, 2010. – 608 с.

6. Юнг, К.Г. Об отношении аналитической психологии к поэтико-художественному творчеству / К.Г. Юнг // Зарубежная эстетика и теория литературы XIX–XX вв. : трактаты, статьи, эссе. – М., 1987. – С. 214–231.

**Практычныя заняткі № 3**. Рытуальна-міфалагічная крытыка

1. Тэарэтычныя ўстаноўкі рытуальна-міфалагічнай крытыкі.
2. Аналіз асноўных палажэнняў працы Н. Фрая “Анатомія крытыкі”.

*Літаратура*

1. Афасижев, М.Н. Западные концепции художественного творчества / М.Н. Афасижев. – М. : Высш. школа, 1990. – 176 с.

Репозиторий ВГУ

2. Бароўка, В.Ю. Тэорыя літаратуры / В.Ю. Бароўка. – Віцебск : Выд-ва Віцеб. дзярж. ун-та, 2005. – 48 с.

3. Козлов, А.С. Литературоведение Англии и США XX века / А.С. Козлов. – М. : Высш. школа, 2004. – 275 с.

4. Нефедов, Н.Т. История зарубежной критики и литературоведения / Н.Т. Нефедов. – М. : Высш. школа, 1988. – 271 с.

5. Фрай, Н. Анатомия критики / Н. Фрай // Зарубежная эстетика и теория литературы XIX–XX вв. : трактаты, статьи, эссе. – М., 1987. – С. 232–263.

**Практычныя заняткі № 4.** Структуралізм

1. Тэарэтычныя ўстаноўкі структуралізму.
2. Аналіз прац Р. Барта “Крытыка і ісціна”, “Уводзіны ў структурны аналіз апавядальніцкіх тэкстаў”.

*Літаратура*

1. Бароўка, В.Ю. Тэорыя літаратуры / В.Ю. Бароўка. – Віцебск : Выд-ва Віцеб. дзярж. ун-та, 2005. – 48 с.

2. Барт, Р. Критика и истина / Р. Барт // Зарубежная эстетика и теория литературы XIX–XX вв.: трактаты, статьи, эссе. – М., 1987. – С. 349–387.

3. Барт, Р. Введение в структурный анализ повествовательных текстов // Зарубежная эстетика и теория литературы XIX–XX вв.: трактаты, статьи, эссе. – М., 1987. – С. 387–422.

4. Литературный энциклопедический словарь. – М. : Совет. энциклопедия, 1987. – 752 с.

5. Нефедов, Н.Т. История зарубежной критики и литературоведения / Н.Т. Нефедов. – М. : Высш. школа, 1988. – 271 с.

6. Якобсон, Р.О. Лингвистика и поэтика / Р.О. Якобсон // Структурализм : «за» и «против». – М. , 1975. – С. 193–228.

**Практычныя заняткі № 5.** Тартуская школа

1. Навуковыя ідэі Тартускай школы.
2. Прадстаўнікі Тартускай школы.
3. Аналіз кнігі “Аналіз паэтычнага тэксту” Ю.М. Лотмана.

*Літаратура*

1. Литературный энциклопедический словарь. – М. : Совет. энциклопедия, 1987. – 752 с.

2. Лотман, Ю.М. Анализ поэтического текста / Ю.М. Лотман. – Л. : Просвещение, 1972. – 271 с.

3. Лотман, Ю.М. Структура художественного текста / Ю.М. Лотман. – М. : Искусство, 1970. – 384 с.

Репозиторий ВГУ

**Практычныя заняткі № 6**. Герменеўтыка

1. Паняцце пра герменеўтыку. 2. Асноўныя ідэі герменеўтыкаў. 3. Развіццё герменеўтыкі. 4. Рэцэптыўная крытыка. 5. Аналіз кнігі Г.Г. Гадамера "Ісціна і метад".

*Літаратура*

1. Бароўка, В.Ю. Тэорыя літаратуры / В.Ю. Бароўка. – Віцебск : Выд-ва Віцеб. дзярж. ун-та, 2005. – 48 с.

2. Гадамер, Г.Х. Истина и метод : основы филос. герменевтики / Г.Х. Гадамер. – М. : Прогресс, 1988. – 699 с.

3. Литературный энциклопедический словарь. – М. : Совет. энциклопедия, 1987. – 752 с.

4. Нефедов, Н.Т. История зарубежной критики и литературоведения / Н.Т. Нефедов. – М. : Высш. школа, 1988. – 271 с.

**Практычныя заняткі № 7**. Герменеўтыка

1. Узнікненне і развіццё гісторыка-функцыянальнага літаратуразнаўства.

2. Аналіз работ М.М. Бахціна "Формы часу і хранатопу ў рамане", "Эпас і раман".

3. Асноўныя палажэнні манаграфіі З.П. Мельнікавай "Беларускае гісторыка-функцыянальнае літаратуразнаўства".

*Літаратура*

1. Бахтин, М.М. Литературно-критические статьи / М.М. Бахтин. – М., 1986.

2. Мельнікава, З.П. Беларускае гісторыка-функцыянальнае літаратуразнаўства / З.П. Мельнікава. – Брэст, 2003.

3. Литературный энциклопедический словарь. – М. : Совет. энциклопедия, 1987. – 752 с.

**Практычныя заняткі № 8.** Сацыялагічнае літаратуразнаўства

1. Перадумовы ўзнікнення і развіццё сацыялагічнага напрамку ў XX стагоддзі.

2. Атрыбутыўныя рысы сацыялагічнага напрамку.

3. Сацыялагічны напрамак у беларускім літаратуразнаўстве (М. Байкоў, З. Жылуновіч, М. Піятуховіч, М. Клімковіч, В. Барысенка).

4. Вульгарны сацыялагізм.

*Літаратура*

1. Бароўка, В.Ю. Тэорыя літаратуры / В.Ю. Бароўка. – Віцебск : Выд-ва Віцеб. дзярж. ун-та, 2005. – 48 с.

Репозиторий ВГУ

2. Мушынскі, М.І. Беларуская крытыка і літаратуразнаўства : 20–30-я гады / М.І. Мушынскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 376 с.
3. Нефедов, Н.Т. История зарубежной критики и литературоведения / Н.Т. Нефедов. – М. : Высш. школа, 1988. – 271 с.
4. Переверзев, В.Ф. У истоков русского реализма / В.Ф. Переверзев. – М. : Современник, 1989. – 750 с.
5. Литературный энциклопедический словарь. – М. : Совет. энциклопедия, 1987. – 752 с.

**Практычныя заняткі № 9.** Літаратуразнаўчыя ідэі Д.С. Ліхачова

1. Жыццёвы і навуковы шлях Д.С. Ліхачова.
2. Аналіз работ Д.С. Ліхачова “Прынцып гістарызму ў вывучэнні літаратуры”, “Кантрапункт стыляў як прадмет вывучэння”, “Будучае літаратуры як прадмет вывучэння” : праблематыка, стыль, навізна.

*Літаратура*

1. Лихачев, Д.С. О филологии / Д.С. Лихачев. – М., 1989.

**Практычныя заняткі № 10.** Сучаснае беларускае літаратуразнаўства

1. Праблематыка сучаснага беларускага літаратуразнаўства.
2. Метадалогія сучаснага беларускага літаратуразнаўства.
3. Аналіз манаграфій “Празаічны тэкст : дынаміка рытмавага існавання” І.В. Жука, “Беларуская класічная літаратура і міфалогія” Т.І. Шамякінай.

*Літаратура*

1. Жук, І.В. Празаічны тэкст : дынаміка рытмавага існавання / І.В. Жук. – Гродна, 2003.
2. Мушынскі, М.І. Беларуская крытыка і літаратуразнаўства : 20–30-я гады / М.І. Мушынскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 376 с.
3. Шамякіна, Т.І. Беларуская класічная літаратура і міфалогія / Т.І. Шамякіна. – Мінск, 2001.

Репозиторий ВГУ

## ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНУ (ЗАЛІКУ)

1. Месца і роля метадалогіі ў навуцы пра літаратуру.
2. Аналіз літаратурнага твора.
3. Метад, прынцыпы, падыход як катэгорыі аналізу.
4. Міфалагічная школа.
5. Неаміфалагізм, рытуальна-міфалагічная крытыка.
6. Міфапаэтыка ў сучасным беларускім літаратуразнаўстве.
7. Культурна-гістарычная школа.
8. Культурна-гістарычны напрамак у беларускім літаратуразнаўстве (працы В. Ластоўскага, Я. Карскага, І. Замоціна).
9. Біяграфічны метад, развіццё яго ідэй у беларускім літаратуразнаўстве.
10. ОПОЯЗ.
11. Кампаратывізм.
12. Структуралізм, генератыўная паэтыка.
13. Герменеўтыка.
14. Імагалогія.
15. Гісторыка-функцыянальнае літаратуразнаўства.
16. Сацыялагічнае літаратуразнаўства. Вульгарны сацыялагізм.
17. Атрапацэнтрычная і тэкстацэнтрычная парадыгмы ў літаратуразнаўстве.
18. Дэканструктывізм, постструктуралізм.
19. "Новы гістарызм", біяпаэтыка.
20. Асноўныя напрамкі сучаснага беларускага літаратуразнаўства.
21. Інтэртэкстуальны падыход у літаратуразнаўстве.
22. Фенаменалагізм.
23. Рэцэптыўная эстэтыка.
24. Прыватнанавуковыя і агульнанавуковыя падыходы да аналізу твораў.

Репозиторий ВГУ

**ЗМЕСТ**

Тлумачальная запіска ………………………………………… 3

Праграма курса “Метадалогія сучаснага літаратуразнўства”... 3

Спіс літаратуры ……………………………………………….. 8

Тэматыка і кароткі змест лекцыйных заняткаў …………….. 13

Планы і тэматыка практычных заняткаў …………………… 44

Пытанні да экзамену (заліку) …………………………….. 49

Репозиторий ВГУ

Вучэбнае выданне

**МЕТАДАЛОГІЯ СУЧАСНАГА ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА**

Метадычныя рэкамендацыі


| | |
|---|---|
| Тэхнічны рэдактар | *Г.У. Разбоева* |
| Карэктар | *Ф.І. Сіўко* |
| Камп'ютарны дызайн | *Т.Я. Сафранкова* |

Падпісана ў друк 14.11.2012. Фармат 60x84$^{1}/_{16}$ . Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 2,90. Ул.-выд. арк. 2,85. Тыраж 80 экз. Заказ 169.

Выдавец і паліграфічнае выкананне – установа адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава".
ЛВ № 02330 / 0494385 ад 16.03.2009.

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава".
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.


Репозиторий ВГУ